КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ №26 (154)
◂ 17 ЛІПЕНЯ ◂ 2009 г.

# Новы Час



**СУСЕД БОГА** Стар. 14

**РЭВАЛЮЦЫЯ ПАКУЛЬ НЕ ПРАГНАЗУЕЦЦА**
Чарговае сацыялагічнае апытанне Незалежнага інстытута сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў (НІСЭПД), зарэгістраванага ў Літоўскай Рэспубліцы, паказала падзел грамадства па шэрагу пытанняў. Стар. 4

**ЧАТЫРНАЦЦАЦЬ ЗАБІТЫХ БІСКУПАЎ**
Каталіцкая грамада краіны баскаў патрабуе бенефікацыі забітых франкістамі біскупаў. Кіраўніцтва іспанскага каталіцкага епіскапату рэзка супраць. Стар. 13

**ВЯРТАННЕ СТРАЧАНАЙ СПАДЧЫНЫ** Стар. 15

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**Нарыс Марыі Мартысевіч**

**Акторка і спявачка Ганна Хітрык**

**З цыклу «Новая генерацыя»**

▸ РОЗДУМ

# МІРАЖЫ ЛІБЕРАЛІЗАЦЫІ

**Вольга ХВОІН**

**Ваўкавыскі прадпрымальнік Мікалай Аўтуховіч на знак пратэсту супраць яго арышту трымаў галадоўку ў следчым ізалятары на Валадарскага дзевяноста адзін дзень. Хрыстос галадаў у пустыні сорак дзён дзеля роздуму, Аўтуховіч галадаў дзеля справядлівасці. Але пакуль яе не дамогся.**

По словах адваката Паўла Сапелкі, стан здароўя Аўтуховіча «крытычны». «Ён ужо дайшоў да таго, што кожны яго рух ці перамяшчэнне даюцца з сілаю і адгукаюцца слабасцю», — перадае словы адваката БелаПАН. Мікалай Аўтуховіч спыніў галадоўку ў адказ на просьбы адваката. «Мне Аўтуховіч патрэбны як яшчэ адзін бок у судзе, бок абароны, — сказаў адвакат. — Справа ўжо падышла да таго моманту, калі трэба знаёміцца з ёй, выпрацоўваць пазіцыю абароны. У галадаючым стане Аўтуховіч паўнавартасна гэтага зрабіць не зможа».

Мікалай Аўтуховіч, Юрый Лявонаў і Уладзімір Асіпенка ў СІЗА ад 8 лютага. Аўтуховіч, патрабуючы перадачы справы ў суд або вызвалення пад падпіску аб нявыездзе, трымае галадоўку ад 16 красавіка. У адказ — працяг следства некалькі разоў, трансфармацыя абвінавачванняў. Справа пра падпал дома міліцыянта ў Ваўкавыску, якую многія праваабаронцы першапачаткова лічылі надуманай і палітычна матываванай, плаўна і нечакана перацякла ў падазрэнні ў тэрарызме. Цяпер Мікалаю Аўтуховічу інкрымінуюць падрыхтоўку замаху на кіраўніка Гродзенскага аблвыканкама Уладзімера Саўчанку і намесніка міністра падаткаў і збораў Васіля Каменку. Таксама падазроным па гэтай справе праходзіць Аляксандр Ларын — былы работнік фірмы «Ніка-транс», якой калісьці кіраваў Мікалай Аўтуховіч.

Грамадзянская супольнасць, праваабаронцы, журналісты даўно б’юць у званы. Афіцыйная Еўропа, у якой улады Беларусі выгандлёўваюць за палітвязняў крэдыты і сяброўства, выказваюць сваю занепакоенасць і настойваюць на тэрміновым правядзенні адкрытага і справядлівага суда. Рэжым працягвае сваю палітыку набівання коштаў. На днях 28 палітычных і грамадскіх дзеячаў перадалі паслу Рэспублікі Польшча ў Беларусі Генрыку Літвіну ліст, у якім выказваюць занепакоенасць у сувязі з трохмесячнай галадоўкай Мікалая Аўтуховіча. Аўтары звароту адзначаюць, што жыццю Аўтуховіча, які паводле праваабаронцаў з’яўляецца палітвязнем, пагражае смяротная небяспека. Падпісанты ліста просяць спадара Літвіна давесці гэтую інфармацыю да прадстаўнікоў дыпламатычных місій іншых краін Еўрасаюза, каб паўплываць на беларускія ўлады і выратаваць жыццё Мікалая Аўтуховіча. Да прадпрымальніка яны звярталіся са словамі: «Спыніся галадаць, такім спосабам у Беларусі яшчэ ніхто нічога не дамогся».

Разам з тым пасол Генрык Літвін на прэс-канферэнцыі ў Мінску заявіў, што «Польшча дзейнічае як сябар Еўрасаюза. І ў межах Еўрасаюза прымаюцца канкрэтныя рашэнні, ініцыятывы, якія сыходзяць з гуманітарнага пункту гледжання. Існуе строгі прынцып, што па справах, якія адносяцца да кампетэнцыі ЕС, каментары і тлумачэнні дае краіна, якая старшынствуе. Асобных ініцыятыў па гэтай справе ў Польшчы не было». Размаўляць пра справу Аўтуховіча спадар Літвін параіў з паслом Швецыі, краіны, якая цяпер кіруе ў Еўрасаюзе. На карце стаяла жыццё чалавека, а чыноўнікі гулялі ў бюракратыю.



Фота Юлі Дарашэвіч

Мікалай Аўтуховіч



www.svaboda.org

Арцём Дубскі

Адной рукой аддаваць, другой — забіраць. Такі прынцып сённяшняй улады. Не паспеў выйсці на свабоду грамадзянін ЗША Эмануіл Зельцэр, як за краты трапіў Арцём Дубскі — удзельнік леташніх акцыяў пратэсту прадпрымальнікаў. 7 ліпеня суд Асіповіцкага раёна асудзіў моладзевага актывіста да года пазбаўлення волі ў выпраўленчай калоніі агульнага рэжыму. Кайданкі на хлопца надзелі ў залі суда. Дубскага абвінавацілі ў парушэнні артыкула 415 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь — ухіленне ад адбыцця пакарання ў выглядзе абмежавання волі. У красавіку 2008 года Арцём Дубскі разам з 14-цю актывістамі быў асуджаны па артыкуле 342 Крымінальнага Кодэкса за ўдзел у мірнай акцыі пратэсту прадпрымальнікаў у Мінску. Сёлета міжнародная праваабарончая арганізацыя *Amnesty International* прызнала Арцёма Дубскага і яшчэ 11 чалавек, якія адбываюць пакаранне ў выглядзе абмежавання волі па гэтай крымінальнай справе, вязнямі сумлення. Так, магчыма Дубскі парушаў рэжым «хатняй» хіміі. Але калі пачынаць спачатку, то вялікія пытанні ёсць да справядлівасці першага прысуду. Адзін нематываваны вырак нарадзіў другі. У чалавека скамечаны лёс, але ў рэжыму свае мэты і планы. Па схеме, якая вельмі нагадвае гандаль заложнікамі: спачатку набраць за краты людзей, пасля з выгадай для сябе іх «прадаць». Усё роўна ў цяперашняй Беларусі крайніх ніхто не знойдзе, ды і шукаць не будзе.

Еўропа патрабуе саступак, рэформаў: у эканоміцы, палітыцы, галіне СМІ. Гэтыя патрабаванні былі выказаныя і ў апошняй рэзалюцыі ПАСЕ па Беларусі. Можна ўявіць, колькі словаў вітання пачуе афіцыйны Мінск, калі праз некалькі месяцаў выпусціць на волю Дубскага, калі «злітуецца» з Аўтуховіча. І ніякай працы па паляпшэнню іміджу рабіць не трэба. Фабрыка па вытворчасці міражоў лібералізацыі працуе спраўна.

## НАВІНЫ РЭГІЁНАЎ

### ГЕРМАНОВІЧЫ. СУСТРЭЧА КРАЯЗНАЎЦАЎ

У вёсцы Германовічы прайшла Віцебская абласная канферэнцыя «Апошнія краязнаўчыя дасягненні Дзісеншчыны». Яна адбылася ў літаратурна-мастацкім музеі імя Міхася Райчонка — літаратара, даследчыка мясцовай даўніны, які ў маладым веку заўчасна адышоў у нябыт. Арганізавала мерапрыемства кіраўнік культурна-асветніцкага цэнтра імя Язэпа Драздовіча Ада Райчонак. На канферэнцыю сабралася болей за 40 краязнаўцаў з Мінска, Віцебска, Браслава, Глыбокага, Міёр, Шаркаўшчыны. Былі абмеркаваны пытанні пошуку рэчавых, выяўленчых і пісьмовых рэліквій, а таксама праблемы стварэння экспазіцый грамадскіх музеяў і формы іх працы.

### АШМЯНЫ. ЛЕПШЫЯ НА ГРОДЗЕНШЧЫНЕ

Эксперты Мінскага сталічнага саюза прадпрымальнікаў і працадаўцаў склалі рэйтынг самых гасцінных для бізнесу беларускіх гарадоў. На Гродзеншчыне першае месца занялі Ашмяны. На Віцебшчыне ў лідэрах — Полацк і Дзісна, а агулам па краіне — Ліда і Крычаў. Такое даследаванне ў Беларусі правялі ўпершыню. Адмыслоўцы цэлы год вывучалі беларускія гарады па розных крытэрах. Улічвалася і колькасць бізнесменаў у горадзе і тое, колькі грошай яны прыносяць у гарадскую казну, а таксама якую прадукцыю прадпрымальнікі прадаюць за межамі свайго горада. Мінск складальнікі рэйтынгу ў разлік вырашылі не браць.

### ВІЦЕБСК. ЧАРГОВЫ ПАДАРУНАК З РАСІІ

Пакольki афіцыйны вываз з Расіі арыгіналаў твораў выяўленчага мастацтва абмежаваны законам і мае пэўную працэдуру, кіраўнік адміністрацыі прэзідэнта гэтай краіны Сяргей Нарышын падараваў гораду 6 копій палотнаў знакамітага мастака Іллі Рэпіна. «У мінулы год падчас «Славянскага базару ў Віцебску» я наведаў музей-сядзібу Здраўнева, дзе працаваў у свой час мастак, — патлумачыў Нарышын. — І ў мяне ўзнікла ідэя перадаць Віцебску падарунак». Копіі твораў размешчаны ў Віцебскім мастацкім музеі.

**Падрыхтаваў Язэп Палубятка**

▸ АРГКАМІТЭТ

# ДА 600-ГОДДЗЯ ПЕРАМОГІ ПАД ГРУНВАЛЬДАМ

**Нацыянальны аргкамітэт па падрыхтоўцы і святкаванні 600-годдзя перамогі пад Грунвальдам створаны 14 ліпеня ў Мінску на сходзе грамадскасці, прысвечаным святкаванню юбілею найбуйнейшай бітвы XV стагоддзя аб'яднаных армій Польскага каралеўства і Вялікага княства Літоўскага з войскам Тэўтонскага ордэна.**

Старшынёй аргкамітэта абраны доктар гістарычных навук прафесар Анатоль Грыцкевіч, яго першым намеснікам — мастак Мікола Купава, намеснікамі — мастак Аляксей Марачкін, кандыдат гістарычных навук Эдвард Зайкоўскі і краязнаўца Леанід Акаловіч.

Паводле слоў Грыцкевіча, бітва 15 ліпеня 1410 года пад Грунвальдам мае непасрэднае дачыненне да гісторыі Беларусі, паколькі 28 з 40 харугваў войска ВКЛ былі з беларускіх земляў, а чатыры харугвы з так званых літоўскіх земляў у асноўным таксама складаліся з беларускіх воінаў. Падчас Вялікай вайны 1409–1411 гадоў амаль уся тэрыторыя цяперашняй Літвы, за выключэннем Вільні і яе наваколляў, была акупаваная крыжакамі, падкрэсліў навуковец. Ён заклікаў дзяржаўныя структуры Беларусі і афіцыйных беларускіх гісторыкаў «фактычна не адмаўляцца ад свайго гераічнага мінулага» і прыняць прапанову пасла Літвы ў Беларусі Эдмінаса Багдонаса пра сумеснае святкаванне 600-годдзя перамогі пад Грунвальдам.

Як адзначыў Купава, 21 лістапада 2008 года прадстаўнікі грамадскасці накіравалі зварот прэм'ер-міністру Сяргею Сідорскаму з прапановай узвесці ў Мінску манумент перамогі пад Грунвальдам. Аўтары ліста прапанавалі да мая 2009 года прыняць урадавае рашэнне пра ўзвядзенні помніка, да ліпеня 2009 года падвесці вынікі конкурсу на месца для помніка, да красавіка 2010 года правесці адкрыты конкурс на найлепшы праект манумента, да чэрвеня 2010 года закласці мемарыяльны камень на месцы будучага манумента, а затым пабудаваць яго на працягу пяці гадоў.

Паколькі на зварот не было атрымана ніякага адказу, па гэтым пытанні сябры аргкамітэта вырашылі звярнуцца да кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта Уладзіміра Макея і паўторна да Сідорскага.

**БелаПАН**

▸ СЛУХАННІ

# АД ГКС ЧАКАЮЦЬ СПРАВАЗДАЧЫ

**20 ліпеня прадстаўнікі недзяржаўных арганізацый правядуць слуханні аб працы Грамадска-кансультацыйнага савета (ГКС) пры Адміністрацыі прэзідэнта Беларусі. Пра гэта паведаміў кіраўнік ГА «Агенцтва гуманітарных тэхналогій» Уладзімір Мацкевіч 14 ліпеня на прэс-канферэнцыі ў Мінску.**

Паводле яго слоў, пакуль невядома, ці возьме ўдзел у слуханнях запрошаны на іх кіраўнік Адміністрацыі прэзідэнта, кіраўнік ГКС Уладзімір Макей.

З ініцыятывай правесці падобную сустрэчу прадстаўнікі грамадзянскай супольнасці выступілі месяц таму. 15 чэрвеня членам ГКС былі разасланыя адпаведныя прапановы. Некаторыя з іх пацвердзілі сваю гатоўнасць удзельнічаць у слуханнях. У той жа час частка членаў савета пагадзілася на ўдзел у слуханнях толькі ў тым выпадку, калі на іх будзе прысутнічаць Макей.

Як адзначыў Мацкевіч, сярод прадстаўнікоў "трэцяга сектара" існуе меркаванне, што Грамадска-кансультацыйны савет па сутнасці сваёй такім не з'яўляецца.

«Адзін з прадстаўнікоў НДА, які ўваходзіць у склад савета, сказаў, што разглядае сябе як кансалтынгавую асобу і не можа нічога гаварыць без ухвалення кіраўніка савета», — сказаў Мацкевіч.

Ён таксама паведаміў, што на сайце *eurobelarus.info* чытаў меркаванне члена ГКС Мікалая Чаргінца пра тое, што ў Беларусі няма грамадзянскай супольнасці. «Гэта — красамоўны паказчык. Беларускае грамадства дагэтуль, з савецкіх часоў, не разглядаецца як самастойная структура», — лічыць Мацкевіч.

Аднак, паводле яго слоў, грамадзянская супольнасць Беларусі «не мае патрэбы ў нейкіх санкцыях і прадстаўніках у якіх-небудзь саветах». «І я, і вы, і любы іншы чалавек, хто мае актыўную грамадзянскую пазіцыю і адкрыта яе выказвае, з'яўляецца прадстаўніком грамадзянскай супольнасці», — падкрэсліў Мацкевіч.

Уладзіслаў Вялічка, лідэр кансорцыума «ЕўраБеларусь» (Літва), у які ўваходзіць у тым ліку шэраг беларускіх НДА, заявіў, што на маючых адбыцца слуханнях хацелася б абмеркаваць «ролю, месца і функцыі ГКС у сучасных беларускіх рэаліях».

«Для чаго ён створаны, якія функцыі ён выконвае, што ён цяпер робіць і якія магчымасці ў яго ёсць. Адна з галоўных праблем — вялікі дэфіцыт інфармацыі пра яго дзейнасць», — падкрэсліў Вялічка.

Паводле яго слоў, прадстаўнікоў грамадскасці цікавіць магчымасць уносіць пытанні ў парадак дня пасяджэнняў ГКС — напрыклад, пра рэгістрацыю НДА, адмену артыкула Крымінальнага кодэкса аб дзейнасці ад імя незарэгістраванай арганізацыі і іншыя.

«У тым выглядзе, у якім савет цяпер існуе, ён не з'яўляецца выніковым. Але сама па сабе ідэя грамадскага савета дзеяздольная, калі яе рэалізаваць па-іншаму. Са значна большай сувяззю з грамадствам, са значна большым удзелам прадстаўнікоў НДА», — перакананы Вялічка.

**БелаПАН**

▸ ФІЛЬМ

# САВЕЦКАЯ ГІСТОРЫЯ

**Тэлеканал «Белсат» паказаў сенсацыйны дакументальны фільм «Савецкая гісторыя». Стужка распавядае пра камуністычныя злачынствы на тэрыторыі былога СССР.**

«Савецкая гісторыя» («*The Soviet story*»), створаная латвійскім рэжысёрам Эдвінасам Шнорэ, распавядае пра Галадамор на Украіне (1932–1933), катынскі расстрэл (1940), цесную супрацу НКВД і гестапа (1939–1941), масавыя дэпартацыі ўглыб Савецкага Саюза пасля другой сусветнай вайны, медычныя эксперыменты на зняволеных ГУЛАГу ды інш. Фільм здымалі 2 гады, а збор матэрыялаў да стужкі заняў больш за 10 гадоў. У фільме выкарыстоўваюцца як унікальныя архіўныя дакументальныя матэрыялы, так і інтэрв'ю ахвяр злачынстваў, якім удалося выжыць, ды гутаркі з вядомымі асобамі. Сярод апошніх — прафесар Норман Дэйвіс, Міхаіл Гарбачоў, Уладзімір Букоўскі, Віктар Суvotaраў, а таксама дэпутаты Еўрапейскага парламента.

▸ ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# ПРЭФЕРЭНЦЫІ НА ПЭЎНЫХ УМОВАХ

**Алена ЗАПАЛЯНСКАЯ**

**Еўрасаюз гатовы вярнуць гандлёвыя прэферэнцыі Беларусі пры ўмове выканання канвенцый Міжнароднай арганізацыі працы «Аб свабодзе асацыяцый і абароне правоў на арганізацыю» № 87 і «Аб прымяненні прынцыпаў права на арганізацыю і на вядзенне калектыўных перамоваў» № 98.**

Яшчэ ў чэрвені МАП прыняла рэзалюцыю, дзе для Беларусі рэкамендавалася працягнуць крокі па выпраўленню сітуацыі, у прыватнасці, са свабодай асацыяцыяў. МАП таксама звярнулася да афіцыйнага Мінска з просьбай прадставіць канкрэтны план дзеянняў.

Сярод станоўчых крокаў афіцыйнага Мінска МАП адзначыла правядзенне ў ліпені мінулага года ў Мінску міжнароднага семінара па абароне супрацоўнікаў ад дыскрымінацыі праз сяброўства ў прафсаюзах, а таксама семінара па выкананні рэкамендацый МАП у студзені 2009 года. Асабліва адзначаецца рашэнне ўключыць у склад Нацыянальнай рады па працоўных і сацыяльных пытаннях трох прадстаўнікоў Беларускага кангрэса дэмакратычных прафсаюзаў. Пры гэтым, па меркаванню аўтараў рэзалюцыі, усе намаганні Беларусі пакуль не прывялі да заўважных зменаў.

Па словах віцэ-прэм'ера Беларусі Уладзіміра Сямашкі, у выніку пазбаўлення прэферэнцый краіна згубіла каля 80–85 мільёнаў долараў. У сваю чаргу кіраўнік Беларускага кангрэса дэмакратычных прафсаюзаў лічыць: «Палітычны дыялог паміж Мінскам і Бруселем не азначае аўтаматычнага вяртання прэферэнцый. І ў дадзенай сітуацыі наўрад ці можна казаць, што гандлёвыя льготы вернуць Беларусі бліжэйшым часам».

Адзначым, што Беларусь была выключана з Генеральнай сістэмы прэферэнцый ЕС у 2007 годзе за парушэнне правоў прафсаюзаў.

▸ СВЯТА

# УГОДКІ ТБМ

**На 27 верасня ў Мінску запланавана святкаванне 20-х угодкаў грамадскага аб'яднання «Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны».**

Паводле слоў старшыні ТБМ Алега Трусава, у гэты дзень у сядзібе аб'яднання адбудзецца пасяджэнне чарговай рады таварыства. На ім плануецца разгледзець праекты зваротаў да Адміністрацыі прэзідэнта з прапановай абвясціць 2010 год Годам роднай мовы, а таксама да грамадзян Беларусі з нагоды чарговага перапісу насельніцтва.

На 27 верасня таксама запланавана святочнае пасяджэнне грамадскасці, прысвечанае 20-годдзю ТБМ. У праграме — святочны канцэрт майстроў мастацтва, узнагароджанне актывістаў таварыства памятнымі значкамі і падзякамі, прэзентацыя мастацкага календара і паштовага канверта, прысвечаных 20-годдзю аб'яднання, а таксама «Летапісу ТБМ за 20 гадоў». Месца правядзення пасяджэння будзе вызначана пазней.

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# ЖЫЦЦЁ, ЯК ЯНО ЁСЦЬ

Сяргей САЛАЎЁЎ

**«Не лезь папярод бацькі ў пекла!» — папярэджваюць сваіх нашчадкаў добрыя людзі. Па-першае, бацька займе ля вогнішча добрае месца. Па-другое, ранавата туды лезці. Але ж знойдуцца людзі, якія абавязкова гэта зробяць.**




Аляксандр Лукашэнка не спяшаецца прызнаваць Паўднёвую Асецію і Абхазію. Акрамя таго, ён не спяшаецца ўводзіць у Беларусі расійскі рубель як адзіную з Расійскай Федэрацыяй валюту. Але ж за яго гэта ўжо зрабілі. І не адзін чалавек.

Пашыраны Вышэйшы савет Ліберальна-дэмакратычнай партыі (ЛДП) зацвердзіў праграму патэнцыяльнага кандыдата ў прэзідэнты ад партыі Сяргея Гайдукевіча. Вышэйшы савет ЛДП аднагалосна прыняў рашэнне пра ўключэнне ў праграму патэнцыяльнага кандыдата ў прэзідэнты ад партыі пытанняў прызнання Абхазіі і Паўднёвай Асеціі і пераход Беларусі на расійскі рубель. «Гэта рашэнне прынялі 26 членаў Вышэйшага савета партыі, а таксама кіраўнікі абласных арганізацый», — сказаў Гайдукевіч.

Нягледзячы на тое, што выбары прэзідэнта Беларусі могуць адбыцца ў канцы 2010 — пачатку 2011 года, іх дакладная дата дагэтуль не вызначана, спадар Гайдукевіч хоча паспець першым са сваёй праграмай. Але ягоны імідж моцна папсуе іншае здарэнне.

Дэпутат Мінскага гарадскога савета, намеснік старшыні ЛДП Уладзімір Карунас затрыманы па падазрэнні ў атрыманні хабару. Пра гэта стала вядома са словаў старшага памочніка пракурора Мінска Сяргея Балашова, які паведаміў, што Карунас быў затрыманы 9 ліпеня. У дачыненні да дэпутата гарсавета распачата справа па частцы 2 артыкула 430 КК («атрыманне хабару»). Следства вядзе следчы па найважнейшых справах гарадской пракуратуры. Карунас узяты пад варту і змешчаны ў следчы ізалятар № 1 па вуліцы Валадарскага ў Мінску.

У ЛДП падпалкоўнік запасу Карунас не толькі з'яўляецца намеснікам старшыні партыі, але і ўзначальвае мінскую гарадскую партыйную арганізацыю. Лідэр ЛДП Гайдукевіч не ведае падрабязнасцей затрымання свайго намесніка. «Інтэрнэт-выданні пішуць пра хабар, аднак мы не ведаем, каму ён мог даваць гэты хабар. Цяпер мы спрабуем праясніць гэтую сітуацыю. Мне вядома толькі тое, што апошнія два месяцы яго рэгулярна выклікалі ў Камітэт дзяржбяспекі, куды ён з'яўляўся па першым патрабаванні», — паведаміў Гайдукевіч.

У Мінгарсавеце 54-гадовы Карунас займае пасаду намесніка старшыні камісіі па будаўніцтве, жыллёвай гаспадарцы, землекарыстанні і экалогіі.

Больш за тое, Гайдукевіч чамусьці лічыць, што затрыманне ягонага паплечніка з падазрэннем на хабар дасць яму дадатковыя шанцы на прэзідэнцкіх выбарах! «Ды вы што?! У нас амаль няма партыйцаў, якія б не сядзелі. Нешта і СМІ маўчаць пра Карунаса, не паказваюць па тэлебачанні. Калі пачнуць паказваць, то мне гэта ўздыме рэйтынг разоў у 20!» — гаворыць Гайдукевіч.

Што тут казаць? «Каму вайна, а каму і кароўка дойна». Чалавек сядзіць у турме, ніхто не ведае, за што, а Гайдукевічу — рэйтынг на выбарах.

У выходныя адсвяткаваў юбілей Аляксандр Лукашэнка. 10 ліпеня споўнілася 15 гадоў прэзідэнцтва Аляксандра Лукашэнкі. У гэты дзень у 1994 годзе ён атрымаў пераканаўчую перамогу на першых выбарах прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Прэзідэнцкая форма праўлення была прадугледжана новай Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, якую Вярхоўны Савет прыняў 15 сакавіка 1994 года. Першыя выбары прэзідэнта былі прызначаныя на 23 чэрвеня 1994 года. У іх бралі ўдзел шэсць кандыдатаў, якія прадстаўлялі даволі шырокі спектр палітычных сіл: кіраўнік урада Вячаслаў Кебіч, былы старшыня Вярхоўнага Савета Станіслаў Шушкевіч, лідэр Беларускага народнага фронту «Адраджэнне» Зянон Пазняк, сакратар ЦК Партыі камуністаў Беларусі Васіль Новікаў, кіраўнік Саюза аграрнікаў Беларусі Аляксандр Дубко і дэпутат Вярхоўнага Савета, дырэктар саўгаса «Гарадзец» Шклоўскага раёна Аляксандр Лукашэнка.

У другі тур выйшлі Лукашэнка і Кебіч, якія набралі адпаведна 44,82% і 17,32% галасоў выбаршчыкаў (Пазняк набраў 12,82%, Шушкевіч — 10%, Дубко — 6%, Новікаў — 5%).

Другі тур выбараў прэзідэнта адбыўся 10 ліпеня 1994 года. Аляксандр Лукашэнка атрымаў падтрымку 80,1% выбаршчыкаў. Яго асноўны сапернік — 14,1% галасоў.

Пэўна, з гэтай нагоды Аляксандр Рыгоравіч даў інтэрв'ю аўстрыйскай газеце «*Die Presse*». Самае галоўнае, што ён сказаў, — што ён не рыхтуе маладшага сына ў якасці свайго пераемніка. «У нас гэта немагчыма. І калі я гаварыў пра свайго малыша, то гэта быў звычайны жарт. Але журналісты гэта ўспрынялі чамусьці сур'ёзна», — сказаў ён. Больш за тое, ён сумняваецца, што праз 10 год будзе прэзідэнтам Беларусі. «Наўрад ці. Я думаю, да гэтага часу вырастуць новыя людзі, якія возьмуць у рукі краіну і павядуць яе», — сказаў Лукашэнка. Вось цікава, як гэта ўспрымаць?

Да гэтага юбілею спрычыніўся і прэзідэнт РФ. Расійская газета «Ведомости» паведамляе, што Мядзведзеў запрасіў Лукашэнку ў Маскву на скачкі. Хто з кім будзе скакаць, — невядома, але яўна, што Лукашэнка не будзе «першым нумарам» у гэтых скачках. Таму шмат прычынаў: «мяса-малочная істэрыка», «камбайнавая вайна», расійскія крэдыты, зноў жа, Абхазія і Асеція. Акрамя таго, расійскія калегі значна сапсавалі настрой Лукашэнку для гэтага візіту.

Лідэр ЛДПР Уладзімір Жырыноўскі заклікаў расійскія ўлады больш не спансіраваць рэжым Аляксандра Лукашэнкі. «Прэзідэнт Беларусі Лукашэнка не робіць нічога, каб не дапамога Расіі 50 мільярдаў долараў, беларусы даўно б пагналі Лукашэнку», — мяркуе Жырыноўскі.

Нічога сабе падаруначак! Праўда, трызненні Жырыноўскага ўсім даўно вядомыя. Быў лепшым сябрам Лукашэнкі, і зараз ператварыўся ў ворага. Але ў нас і сваіх ініцыятыўных людзей хапае.

У Беларусі ствараецца новы масавы рух «Юны дзяржынец», які аб'яднае падлеткаў. Мэта арганізацыі — выхаванні беларускай моладзі ў патрыятычным духу. Яна ўжо адчыніла ля Мінска ваенна-спартыўны лагер для падлеткаў. Іх чакаюць маршы, стральба з баявой зброі і трэніроўкі пад кіраўніцтвам спецназаўцаў.

Ну а потым гэтых дзяцей мы дашлем да Жырыноўскага, каб паказаць яму, хто тут нашчадак «жалезнага Фелікса».

| КАЛІ Б ЗАЎТРА АДБЫЛІСЯ ВЫБАРЫ ПРЭЗІДЭНТА БЕЛАРУСІ, ЗА КАГО Б ВЫ ГАЛАСАВАЛІ? | |
|---|---|
| **Варыянт адказу** | **%** |
| А. Лукашэнка | 40,9 |
| А. Мілінкевіч | 3,1 |
| А. Казулін | 2,4 |
| С. Сідорскі | 1,9 |
| Іншы палітык (11 прозвішчаў, менш за 1 % кожны) | 2,7 |
| Іншы адказ | 7,1 |
| Не магу адказаць | 41,9 |

Чэрвеньскае сацыялагічнае апытанне Незалежнага інстытута сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў (НІСЭПД), зарэгістраванага ў Літоўскай Рэспубліцы

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ






### ЗМІЦЕР ВІНАГРАДАЎ

Лета — пара гарачая. А тыя, каму прыроднай спёкі не хапае, тэмпературу падымаюць штучна. Нечаканы прэцэдэнт у апазіцыйным асяродку: старшыня Мінскай абласной арганізацыі Партыі БНФ Зміцер Вінаградаў падаў іск на кіраўніка гарадской суполкі Барысава Сяргея Салаша. Падставаю для гэтага сталі запісы ў прыватным інтэрнэт-дзённіку. Вінаградаў просіць «прызнаць не адпавядаючымі сапраўднасці і ганьбячымі мой гонар, годнасць і дзелавую рэпутацыю звесткі» і «абавязаць Салаша Сяргея Аляксандравіча апублікаваць на тым жа сайце і тым жа шрыфтам абвяржэнне». Да таго ж адзін апазіцыянер просіць спагнаць з другога кампенсацыю за маральную шкоду ў памеры 2 100 000 рублёў. Канфлікт паміж двума палітыкамі цягнецца ад мінулага года. У прыватнасці, Сяргей Салаш сцвярджае, што яму і яго блізкім невядомыя дасылалі SMS-паведамленні абразлівага характару, тэлефанавалі з непрыстойным прапановамі. Салаш з падазрэннем, што гэтая справа рук Вінаградава, звярнуўся ў міліцыю, аднак вінаватых пакуль не знайшлі. Цяпер ужо Зміцер Вінаградаў палічыў сябе пацярпелым і падаў іск са сваімі прэтэнзіямі да аднапартыйца. Сачыце за праграмаю!

### АРЦЁМ МІЛЕЎСКІ



Беларус Арцём Мілеўскі прызнаны найлепшым футбалістам Украіны сезона 2008/2009.

Нападаючы кіеўскага «Дынама» Арцём Мілеўскі перамог у апытанні часопіса «Футбол» і сайта *football.ua* на званне найлепшага гульца Украіны. Галоўным прэтэндэнтам на «Залаты мяч Украіны» быў харвацкі абаронца данецкага «Шахцёра» Дарыё Срна. Арцём Мілеўскі абышоў харвата, набраўшы на 400 балаў больш. Галасаванне праводзілася ў трэці раз. Мілеўскі тройчы заваёўваў тытул чэмпіёна Украіны, і чатыры разы Кубак Украіны, гуляе за нацыянальную зборную Украіны ад 2006 года. У вышэйшай лізе чэмпіянату Украіны за «Дынама» Арцём Мілеўскі згуляў 97 матчаў, забіў 25 галоў. За зборную Украіны футбаліст выступаў 20 разоў, на яго рахунку два галы. У новым сезоне ўраджэнец Беларусі будзе капітанам кіеўскага клуба «Дынама». Арцём Мілеўскі нарадзіўся ў 1985 годзе ў Мінску. У Кіеў пераехаў у 15-гадовым узросце. Дэбютаваў у вышэйшай лізе ў кіеўскім «Дынама» ў маі 2003 года. Яшчэ да пераезду ў Кіеў Мілеўскі паспеў пагуляць за юнацкую зборную Беларусі, але потым выказаў жаданне гуляць за каманду Украіны. Кіяўляне любоўна называюць Арцёма Міля, піша газета «Наша Ніва».

### СЯРГЕЙ СІДОРСКІ




Паны б'юцца, а ў мужыкоў чубы трасуцца. Пасля гандлёвых войнаў з Расіяй кіраўнік беларускага ўраду Сяргей Сідорскі знайшоў крайніх і вінаватых. Савет міністраў Беларусі распарадзіўся звольніць дырэктараў чатырох малочных заводаў і аднаго мясакамбіната. Ад займаемых пасадаў вызваленыя дырэктары ААТ «Аршанскі малочны камбінат», «Акцябрскі завод сухога абястлушчанага малака», «Слонімскі мясакамбінат», «Слуцкі сыраробны камбінат» і «Быхаўмалако». Афіцыйнаю падставаю для такога рашэння з'яўляецца значны рост рэштak гатовай прадукцыі і высокая стратнасць яе рэалізацыі.

Савет міністраў папярэдзіў кіраўнікоў малакаперапрацоўчых прадпрыемстваў пра персанальную адказнасць за рэалізацыю бізнес-планаў развіцця арганізацый, уключна з правядзеннем рэканструкцыі і тэхнічнага пераабсталявання, выкананнем прагнозных балансаў вытворчасці і рэалізацыі малочнай прадукцыі на 2009 год і паніжэннем складскіх запасаў прадукцыі.

ЭКСПЕРТЫЗА

# РЭВАЛЮЦЫЯ ПАКУЛЬ НЕ ПРАГНАЗУЕЦЦА

**Чарговае сацыялагічнае апытанне Незалежнага інстытута сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў (НІСЭПД), зарэгістраванага ў Літоўскай Рэспубліцы, паказала падзел грамадства па шэрагу пытанняў. На першы погляд можа падацца, што беларусы на мяжы расколу. Але, па меркаванню экспертаў, нічога страшнага ў такой тэндэнцыі няма. Для грамадскай думкі характарная неаднароднасць. Пра чыннікі, якія найбольш уплываюць на змены ў калектыўнай свядомасці, і гендэр як фільтр на шляху да кардынальных пераменаў з сацыёлагам Аляксандрам Сасновым размаўляе Вольга Хвоін.**



— Грамадства — структура зменлівая і непастаянная. На гэта ўплываюць розныя фактары, найперш — матэрыяльны стан. Што можна сказаць пра наша грамадства цяпер? Па-першае, насельніцтва добра адчувае эканамічны крызіс. Яшчэ перадапошняе сакавіцкае апытанне гэта паказала. Калі ў снежні эканамічны крызіс увайшоў у жыццё беларусаў толькі першымі крокамі, то ў сакавіку грамадская думка цалкам знаходзілася пад яго ўплывам. У нас ёсць крытэрыі, маркеры, якія паказваюць, як грамадства сябе асэнсоўвае ў дадзены момант. Паводле сакавіцкіх дадзеных, з сацыяльна-эканамічнага пункту гледжання людзі былі напалоханы пачаткам крызісу, дэвальвацыяй беларускага рубля. Таму ўсе гэтыя маркеры паказвалі негатыў. Напрыклад, калі раней больш людзей казалі, што іх дабрабыт палепшыўся, а меншая колькасць, што іх дабрабыт пагоршыўся, то ў сакавіку адказы змяніліся ў адваротным напрамку. Таксама людзі ацэньвалі сацыяльна-эканамічныя перспектывы: тых, хто лічыў іх негатыўнымі, было больш за «аптымістаў». У сакавіку крыху спаўзлі ўніз рэйтынгі ўладных структураў. Але беларуская асаблівасць у тым, што да ўладаў ставяцца роўна, і ваганні гэтыя не значныя.

Чэрвеньскае апытанне паказвае, што людзі прыстасаваліся. Зноў шэраг крытэрыяў пайшоў у пазітыўны бок, павялічылася колькасць тых, хто лічыць, што яго матэрыяльнае становішча не пагоршылася. У сакавіку менш за два працэнты апытаных лічылі, што іх матэрыяльнае становішча не пагоршылася, цяпер такіх пяць з паловаю працэнтаў. Гэта мала, бо раней гэты паказчык даходзіў да 30 працэнтаў, але назіраецца тэндэнцыя. Асобаў, якія лічаць, што іх дабрабыт пайшоў на спад, цяпер 36 працэнтаў. А было — 50. І нават адкрыты рэйтынг Лукашэнкі крыху стаў большы.

***— Эканоміка не адчувае сябе лепш, чым у сакавіку, а грамадская думка скіраваная ў пазітыўны бок. У чым справа?***

— На беларусаў вялікі ўплыў аказвае тэлебачанне. У сакавіку амаль 60 працэнтаў апытаных сказалі, што атрымліваюць інфармацыю з тэлевізара. Значыць, як тэлевізіёншчыкі будуць штодзень казаць, так людзі і будуць думаць. Калі раней Лукашэнка, а за ім і ТБ распавядалі пра кепскі Захад, то большасць выступала за інтэграцыю з Расіяй. Цяпер усё змянілася. Захад — гэта добра. Адразу ж уверх пайшлі крытэрыі, якія звязаныя з інтэграцыйнымі працэсамі з Еўропай. На пытанне «Калі б быў рэферэндум пра аб'яднанне Беларусі і Расіі, як бы вы прагаласавалі?» «за» выказаліся 39 працэнтаў, «супраць» — 44 працэнты апытаных. На такое ж пытанне, але пра аб'яднанне з Еўрасаюзам — «за» 41, «супраць» — 40 працэнтаў. А калі паставіць пытанне рубам: ці Расія, ці Еўрасаюз? 42 працэнты апытаных выказаліся за аб'яднанне з Расіяй, 41 — з Еўрасаюзам. Амаль роўная колькасць прыхільнікаў, хаця раней перавага была на баку інтэграцыі з Расіяй.

Раскол грамадства існуе заўжды. Адзінае, што ён вагаецца ў колькасным сэнсе. Калі раней было прыкладна 30 працэнтаў за Захад і 60 — за Расію, то цяпер палова на палову.

***— Незалежным СМІ давяраюць 45 працэнтаў беларусаў. Цікава было б даведацца, якія рэзервы гэтага даверу, ці ёсць куды расці недзяржаўным газетам, радыёстанцыям?***

— На працягу апошніх год ідзе павелічэнне даверу да недзяржаўных СМІ. І цяпер яны прыкладна на адналькавым узроўні з дзяржаўнымі. Калі ўзяць усіх, хто выказвае свае адносіны да СМІ, і падзяліць паводле крытэрыю стаўлення да прэзідэнта, то мы ўбачым наступнае. З тых, хто давярае прэзідэнту, прыкладна 80 працэнтаў давяраюць дзяржаўным СМІ. А сярод тых, хто не давярае кіраўніку краіны, давер да дзяржаўных СМІ выказваюць менш за 15 працэнтаў. Гэта гаворыць пра тое, што дзяржаўныя СМІ свой рэйтынг амаль выкарысталі. І павышаць яго больш няма за кошт чаго. Сярод тых, хто выказвае недавер прэзідэнту, недзяржаўным СМІ давяраюць недзе 53 працэнты апытаных. Як бачым, рэзервы для павышэння рэйтынгу даверу ў недзяржаўных сродкаў масавай інфармацыі ёсць.

***— Якім чынам насельніцтва спраўляецца з наступствамі эканамічнага спаду?***

— Беларусы прызвычайваюцца, як і іншыя людзі. Найперш скарачаюць свае патрэбы. Да якой мяжы гэта магчыма — я не ведаю. Але мяжа дакладна існуе, калі людзі да яе дойдуць і патрэбы скарацiць больш не змогуць, вырашыць крызіс можна будзе толькі палітычным шляхам. Таму ўлады робяць усё магчымае, каб не давесці грамадства да такога стану.

***— Наколькі вышэй за часы першай паловы дзевяностых мінулага стагоддзя цяперашняя мяжа трываласці?***

> «На кім ляжыць адказнасць за пагаршэнне эканамічнай сітуацыі ў краіне?» Хто на першым месцы? Урад і прэзідэнт — па 41 працэнту, на трэцім месцы — Захад

— У дзевяностыя ў крамах амаль нічога не было, агромістыя чэргі, беспрацоўе, прадпрыемствы прастойвалі... У выніку мы мелі сацыяльны выбух. І Лукашэнка — вынік таго выбуху. Натуральна, што ўзровень патрэбаў цяпер вышэйшы. У крамах хапае тавараў, але нестае грошай. На прадпрыемствах уводзіцца няпоўны працоўны дзень, людзей адпраўляюць у вымушаныя адпачынкі, зніжаюцца персанальныя выплаты і надбаўкі... Сёння мы можам дайсці да такой самай сацыяльнай напружанасці, як і дваццаць гадоў таму. У нас было пытанне: «Колькі разоў за апошнія дванаццаць месяцаў у вас былі затрымкі ў выплатах заробкаў і пенсій?». Пакуль 70 працэнтаў апытаных кажуць, што ні разу. Магчыма, яно і так. Але калі параўноўваць з тым, што было раней, то павялічылася колькасць тых, хто адказаў, што былі. Вы ж бачыце, што робіць урад: з Захаду на Усход — «дайце грошай!».

***— Ці вераць нашы грамадзяне кіраўніцтву краіны?***

— У нас было пытанне: «Беларусі патрэбныя перамены ці стабільнасць?». Самае цікавае, што адказы зноў падзяліліся прыкладна папалам: 48 працэнтаў — патрэбныя, 46 працэнтаў — не. Лукашэнку падтрымліваюць 40 працэнтаў, астатнія не кажуць, што за яго. Зноў раскол. Наступныя пытанні адлюстроўваюць палітычныя настроі ў грамадстве. Напрыклад, «На кім ляжыць адказнасць за пагаршэнне эканамічнай сітуацыі ў краіне?». Хто на першым месцы? Урад і прэзідэнт — па 41 працэнту, на трэцім месцы — Захад, бо СМІ штодня гавораць, што крызіс прыйшоў да нас з Захаду, хаця вядома, што гэта не адпавядае рэчаіснасці. На чацвёртым месцы — мясцовыя ўлады. Яшчэ адно пытанне: «З кім ці чым звязваеце надзеі на эканамічнае развіццё?». Раней заўжды на першым месцы быў прэзідэнт. Цяпер — замежны капітал (53 працэнты), прэзідэнт — толькі 38 працэнтаў, урад — 34 працэнты.

Зараз усё часцей грамадская думка дзеліцца ў адносінах 50 на 50, раней гэты паказчык быў 30 на 60. У цэлым людзі схільныя думаць, што ў краіне ўсё большменш нармальна. На пытанне: «Як вы ацэньваеце палітычную абстаноўку ў Беларусі» 7 працэнтаў рэспандэнтаў адказалі, што яна добрая, 55 — спакойная, 31 працэнт беларусаў лічыць, што абстаноўка напружаная. Прыхільнікаў дзеючай улады — 39 працэнтаў, праціўнікаў — 22 працэнты. Амаль траціна апытаных сышлі ад адказу на гэтае пытанне. Амаль палова — 48 працэнтаў апытаных — лічаць, што ў цэлым справы ў краіне развіваюцца ў правільным накірунку, 34 працэнты з імі ня згодныя. У прынцыпе разбежка ў ацэнках невялікая, таму рэвалюцыі пакуль не прагназуецца.

***— Было б да месца пагаварыць і пра палітычныя партыі, давер да іх.***

— Мы наконт партый апытанняў не праводзілі. У гэтым няма сэнсу, улічваючы, што іх рэйтынг у межах статыстычнай памылкі. Калі б была ўладная партыя ці прапарцыйная электаральная сістэма, усё б змянілася.

***— Апазіцыйныя партыі маюць паказчык даверу ў 19 працэнтаў...***

— Гэта яшчэ добра. Бывала, што апытанні паказвалі па сем-восем працэнтаў. Да самога панятця «партыя» адносіны ва ўладаў кепскія, ідзе пасыл, што партыі нам не патрэбныя. Самае смешнае, што і да прафсаюзаў стаўленне дрэннае. Улады ведаюць, што прафсаюзы патрэбныя, каб мець адносіны з Еўропай, Міжнароднай арганізацыяй працы. Але для чаго яны — Лукашэнка прыдумаць не можа. У савецкія часы прафсаюзы былі ўбудаваныя ў сістэму. Зараз па ступені даверу нават міліцыя абышла прафсаюзы, гэта адлюстраванне таго, што для ўладаў насамрэч мае значэнне.

***— У дзяржаўных СМІ перыядычна з'яўляюцца матэрыялы, у якіх дыскрэдытуецца дзейнасць незалежных праваабаронцаў і праваабарончых аб'яднанняў. Што на гэты конт гаворыць сацыялогія?***

— Пра праваабаронцаў гаворыцца мала. І працэнт даверу да іх у грамадстве невялікі. Паводле апытання, адказы рэспандэнтаў «давяраю», «не давяраю», «не магу адказаць» падзяліліся прыкладна ў роўных суадносінах. Звычайна такое назіраецца, калі людзі не ведаюць прадмета апытання.

***— Адно з апошніх патрабаванняў Еўрасаюза для вяртання Беларусі статуса адмыслова запрошанага ў ПАСЕ — адмена ў краіне смяротнага пакарання. На рэферэндуме 1996 года грамадскасць большасцю галасоў выказалася за яго захаванне. Што думаюць беларусы на гэты конт цяпер?***

— Вельмі цікавае пытанне. Супраць адмены смяротнай кары выказаліся 48 працэнтаў, за адмену — 42 працэнты рэспандэнтаў. Перакрыжоўваючае, праверачнае пытанне гэту думку пацвердзіла. Хто гэтыя людзі, якія выступаюць за адмену смяротнай кары? Калі думаць лагічна, то гэта мусяць быць асобы з еўрапейскім мысленнем, прасунутыя, з высокім узроўнем даходаў, мужчыны. Але аказваецца, што за адмену выступаюць ніжэйшыя слаі насельніцтва, за захаванне — больш высокія. Абсурдна? У мяне ёсць гіпотэза, што ва ўмовах, калі наша краіна знаходзіцца на трэцім месцы ў свеце па пасадцы ў турмы, нізкія слаі прызвычаіліся да пакаранняў і думаюць: «А раптам гэта закране мяне, то лепш адмяніць». А сярод больш багатых лунае такая думка: «Гэта ж яны, злачынцы з нізоў, то лепш захаваць».

***— Паводле вашых слоў, мужчыны больш прасунутыя і лепш успрымаюць перамены. Няўжо жанчыны такія закасцянелыя ў сваіх поглядах?***

— Жанчыны больш гуманныя, таму яны больш выступаюць за адмену смяротнай кары. Але ў цэлым жанчыны кансерватыўныя. І гэта біялагічна апраўдана. Толькі ярыя фемініcткі не захоўваюць традыцыйнасць, на якой грунтуецца захаванне біялагічнага віду. Задача мужчыны — прыўнесці генетычную разнастайнасць, задача жанчыны — яе захаваць. Адсюль і светапогляд, адчувальнасць да наваўвядзенняў.

БІЗНЕС

# ХТО АЦЭНІЦЬ ЛІБЕРАЛІЗАЦЫЮ

Вольга ХВОІН

**Міністэрства эканомікі рапартуе пра дасягненні ў сферы лібералізацыі дробнага бізнесу. Індывідуальныя прадпрымальнікі лічаць, што ўзаемадачыненні з дзяржавай з мёртвай кропкі не скрануліся.**

За шэсць месяцаў гэтага года былі прынятыя 52 нарматыўна-прававыя акты ў межах плану першачарговых мерапрыемстваў па лібералізацыі ўмоў ажыццяўлення эканамічнай дзейнасці ў 2009 годзе, яшчэ 19 праектаў нарматыўных актаў чакаюць сваёй чаргі да разгляду.

Дырэктар дэпартамента па прадпрымальніцтву Міністэрства эканомікі Беларусі Аляксандр Ліхачэўскі паведаміў журналістам, што сёлета была скарочаная колькасць адміністрацыйных працэдур у сферы аховы здароўя, транспарту, будаўніцтва ды іншых, спрошчаны парадак правядзення аўкцыёнаў і конкурсаў на зямлю, зменены парадак распараджэння дзяржаўнай маёмасцю. Мяркуецца, што сёлета падатковая нагрузка ў рэспубліцы знізіцца на 1,3 працэнтных пункта ад ВУП, такім чынам у суб'ектаў гаспадарання застанецца каля двух трыльёнаў беларускіх рублёў.

На дадзены момант распрацаваны праект пастановы ўрада аб удасканаленні парадку падрыхтоўкі і разгляду інвестыцыйных дамоваў з Рэспублікай Беларусь. Мясцовыя выканкамы могуць атрымаць права заключаць інвестыцыйныя дамовы ад імя Рэспублікі Беларусь. Па ініцыятыве Міжнароднага валютнага фонду ў Беларусі плануецца ствараць фонды банкаўскага кіравання. Праект адпаведнага ўказа цяпер знаходзіцца на разглядзе ў Адміністрацыі прэзідэнта.

Таксама ўрад дапрацоўвае праект указа кіраўніка дзяржавы аб спрашчэнні ліцэнзавання асобных відаў прадпрымальніцкай дзейнасці. Праект указа зацвярджае пералік відаў дзейнасці, работ і паслуг, якія ліцэнзуюцца. «Мы лічым, што гэта дазволіць скараціць агульную колькасць відаў дзейнасці на 8–9 найменняў і больш чым на 50 — колькасць работ і паслуг», — паведаміў Аляксандр Ліхачэўскі. Названы праект указа прадугледжвае скарачэнне тэрмінаў выканання працэдур ліцэнзавання: заявы на выдачу ліцэнзій, унясенне змяненняў і дапаўненняў будуць разглядацца не 30, а 15 дзён, заявы аб працягненні дзеяння ліцэнзіі — 10 дзён замест 30-ці.

> «Я не разумею, навошта гэты дэпартамент увогуле трымаюць. Мы пішам лісты, збіраем подпісы, прыходзім да іх з праблемамі, а ў адказ толькі паціскаюць плячыма»

Істотным наваўвядзеннем будзе адмена ліцэнзавання рознічнага гандлю і грамадскага харчавання (выключэнне складае гандаль падакцызнымі таварамі: алкаголем і тытунём). А з 1 студзеня 2012 года плануецца адмяніць ліцэнзаванне перапрацоўкі рыбы і морапрадуктаў. Упраўленне справамі прэзідэнта, якое адказвае за гэты від дзейнасці, мусіць да 2012 года пракантраляваць пераабсталяванне вытворчых магутнасцяў у рыбнай гаспадарцы. З 2012 года перапрацоўка рыбы і морапрадуктаў будзе рэгулявацца тэхнічнымі нарматыўнымі актамі.

Цяпер у Беларусі ліцэнзуюцца 53 віды дзейнасці. Агульная колькасць выдадзеных ліцэнзій складае 218 тысяч. З іх юрыдычным асобам выдадзена 72 тысячы, індывідуальным прадпрымальнікам — 144 тысячы, грамадзянам — 1,7 тысячы.

Дырэктар дэпартамента па прадпрымальніцтву Міністэрства эканомікі Беларусі Аляксандр Ліхачэўскі паведаміў, што падрыхтаваны праект закона аб малым і сярэднім бізнесе, і бліжэйшым часам ён можа быць адпраўлены на разгляд у парламент. Прадстаўнік Мінэканомікі лічыць, што не варта спадзявацца на імгненны эфект ад прынятых нарматыўных прававых актаў. Вынікаў можна чакаць прыкладна праз год. Дарэчы, як паведаміў Ліхачэўскі, Беларусь мае намер увайсці ў трыццаць краінаў з найлепшымі ўмовамі для вядзення бізнесу.

Старшыня рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Перспектыва» Анатоль Шумчанка не падзяляе ўпэўненасці чыноўнікаў у тым, што працаваць дробным бізнесоўцам стала лягчэй. «Малы бізнес і дзяржава па-рознаму разумеюць паняцце «лібералізацыя». З кожным днём мы ўсё больш і больш пераконваемся, што глядзім на жыццё з розных ракурсаў, — адзначае лідэр прадпрымальніцкага руху. — Лібералізацыя — гэта найперш уменне слухаць адзін аднаго і не рабіць брыдасцяў. Тое, што адбываецца, абсалютна нічым не адрозніваецца ад ранейшых дзеянняў уладаў. Адносіны да прадпрымальнікаў выключна спажывецкія, прыгнятаючыя».

Паводле слоў Шумчанкі, найбольш праблем з забаронаю гандляваць дробнай рознiцай асобнымі відамі тавараў, высокімі стаўкамі арэнды ў гандлёвых цэнтрах і падаткамі. Разам з тым, прадпрымальнік прызнае, што стала менш штрафаў і канфіскацый тавараў пасля ўвядзення мараторыя на праверкі. Многа пытанняў выклікае і недзеяздольнасць дэпартамента па прадпрымальніцтву Мінэканомікі. «Я не разумею, навошта гэты дэпартамент увогуле трымаюць. Мы пішам лісты, збіраем подпісы, прыходзім да іх з праблемамі, а ў адказ толькі паціскаюць плячыма», — заўважае кіраўнік «Перспектывы».




Photo.ByMedia.Net

Анатоль Шумчанка

КОНКУРС

## ЛЕПШЫ ПРАДПРЫМАЛЬНІК 2008 ГОДА

**Указам прэзідэнта Беларусі вызначаны пераможцы і лаўрэаты рэспубліканскага конкурсу «Лепшы прадпрымальнік 2008 года».**

Дакумент апублікаваны на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале. Конкурс праводзіўся па 16 намінацыях. У намінацыі «Лепшы прадпрымальнік у галіне вытворчасці спажывецкіх тавараў» перамагло беларуска-італьянскае СП «РЭЛУІ БЕЛ», у намінацыі «Лепшы прадпрымальнік у галіне вытворчасці прадуктаў харчавання» — прыватнае гандлёва-вытворчае унітарнае прадпрыемства «Белмяспрамінвест» (Мінск).

У будаўнічай галіне лепшым прызнана сумеснае таварыства з абмежаванай адказнасцю «СБА Стройрэцыклінг» (вёска Вялікія Матыкалы Брэсцкага раёна), у сферы медыцынскай дзейнасці — замежнае прыватнае унітарнае вытворча-гандлёвае прадпрыемства «Медіндустрыя Сэрвіс» кампаніі «Бішоп Медыкал Сэплаіз Лімітэд» (Мінск), у турызме — прыватнае экскурсійна-турыстычнае унітарнае прадпрыемства «Саквояж» (Брэст).

Лепшай арганізацыяй з замежнымі інвестыцыямі названа сумеснае прадпрыемства з абмежаванай адказнасцю «Топ Камфорт» (вёска Новая Гожа Гродзенскага раёна), лепшым прадпрымальнікам-экспарцёрам — сумеснае закрытае акцыянернае таварыства «ФІДМАШ» (Мінск), лепшым арганізатарам новых працоўных месцаў прызнана замежнае прыватнае унітарнае вытворча-гандлёвае прадпрыемства «ЭПАМ Сістэмз» (Мінск).

Пераможца ў намінацыі «Лепшы банк па аказанні паслуг прадпрымальнікам» не вызначаны, а лаўрэатамі сталі «Белгазпрамбанк» і «Банк ВТБ».

ПАДАТКІ

# ПЛАЦІ І НЕ АБМЯРКОЎВАЙ

**Якім чынам падвышэнне арэнднай стаўкі адаб'ецца на жыцці малога бізнесу? Знайсці адказ на гэта пытанне спрабавала Вольга Лісічонак разам з прадпрымальніцай Аксанай М. са сталічнага рынка «Ждановічы».**

***— Колькі падаткаў вы плаціце штомесяц?***

— Варта пачаць з таго, што ўсе падаткі ў нас налічваюцца ў еўра па курсу Нацбанка, які ўжо ўзяў планку ў чатыры тысячы беларускіх рублёў. Асабіста я плачу па схеме 88 еўра памножаныя на 2 плюс НДС. Атрымліваецца недзе 1 400 000–1 500 000 рублёў штомесяц. Гэта толькі сам падатак. Да гэтага мы яшчэ аплачваем арэнду на рынку, якая таксама налічваецца ў еўра.

***— Ці праўда, што апошні раз арэнда была падвышана па пажаданнях саміх прадпрымальнікаў?***

— Падвысілі не толькі арэнду, але і сам падатак. А наконт таго, што гэта адбылося па просьбе саміх прадпрымальнікаў — проста смешна. Нас паставілі перад фактам. Хочаш працаваць — плаці і не абмяркоўвай. Патлумачылі падвышэнне тым, што падняўся курс долара і еўра, таму стала нерэнтабельна здаваць месцы па ранейшых коштах. Хаця па ўказах кіраўніка дзяржавы з прычыны крызісу аплата арэнды не толькі не павінна была расці, але і знізіцца на 20 працэнтаў.

Справа ў тым, што рынак «Ждановічы» лічыцца прыватным, таму павысілі, бо быццам бы маюць на гэта права. Такім чынам арэндная плата зараз складае 15 еўра за квадратны метр. Мы маем 20 метраў плошчы, таму плацім прыкладна 1 300 000 штомесяц. Вось і атрымліваецца, што разам з падаткам плацім 2 600 000–2 700 000 рублёў.

**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.45** «Званая вячэра».
**12.35** «Шырокая рака». Серыял.
**13.30** «24 гадзіны».
**13.50** «Дабры дзень, доктар!».
**14.20** «Дарагая перадача».
**14.40** «Гадкае качаня». Моладзевы серыял.
**15.30** «Крот». Серыял.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Новыя вандраванні дылетанта».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Шырокая рака». Серыял.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «Сталічны падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.35** «Камедыя па пятніцах»: «Алібі». ЗША-Нідэрланды, 2006г.
**22.30** «24 гадзіны».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** Агляд міжнароднага шоу-бізнэсу.
**23.40** «Для тых, хто не спіць»: «Штармавое папярэджанне». Аўстралія, 2007г.
**01.05** «Уцёкі». Серыял.

**06.55** Добрая раніца.
**07.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.20** Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Турэцкага» (Расія).
**09.05** У гэты дзень.
**09.10** Гадзіна суду.
**10.05** Час футбола.
**10.35** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**11.15** Серыял «Дзве лёсу» (Расія).
**12.10** Моладзевы дэтэктыўны серыял «Вераніка Марс-2» (ЗША).
**12.55** Жаночая ліга.
**13.20** Невытлумачальна, але факт.
**14.10** Мультсерыял «Сонік Ікс». 1-я серыя.
**14.35** Пазакласная гадзіна.
**14.45** Школа рамонту.
**15.35** Гадзіна суду.
**16.30** Смачна з Барысам Бурдой.
**16.55** Медычныя таямніцы з доктарам А.Цярэшчанкам.
**17.30** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**18.15** Пасоўванне+.
**18.35** Навіны культуры.
**18.50** Дакументальны фільм «Тут, цяпер, сёння» (Беларускае тэлебачанне).
**19.20** Бітва экстрасэнсаў.
**20.15** Калыханка.
**20.35** Экспедыцыя.
**20.40** Рамантычная камедыя «Лавелас».
**22.05** «Іншыя». Псіхалогія крыміналу.
**22.35** Драма «Кропка» (Расія).

РОССИЯ

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.25** Тэлесерыял «Кармеліта».
**11.00** Весткі.
**11.25** Руская серыя. «Майстар і Маргарыта». Тэлесерыял.
**12.25** Тэлефільм «Хадня па пакутах». 10-я серыя.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.20** Фільм «Не сышліся характарамі».
**15.50** «Пышны князь. Рыгор Пацёмкін». Фільм Аляксея Дзянісава. Дак. фільм.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.25** «Кулагін і партнёры».
**17.55** «Трымай мяне мацней». Тэлесерыял.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Тэлесерыял «Кармеліта».
**21.25** Руская серыя. «Майстар і Маргарыта». Тэлесерыял.
**22.35** Навіны - Беларусь.
**22.45** Фільм «Жыццё адно».

НТВ

**06.00** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал «Сёння раніцай».
**08.05** «Масква-Ялта-транзіт».
**09.40** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Рэпарцёр А. Зіненка». Лепшыя фільмы.
**10.45** «Шнур вакол света».
**11.15** Вострасюжэтны баявік «Спецназ па-руску-2».
**12.05** «Сярэдні клас».
**13.00** Сёння.
**13.35** Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара-2».
**15.05** Серыял «Аэрапорт».
**16.00** Сёння.
**16.30** Крымінальны серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».
**18.15** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** «Следства вялі...».
**20.30** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Дарожны патруль».
**22.30** Меладрама «Бачнасць гневу».
**00.35** Венсан Касель, Майкл Мэдсен у прыгодніцкім вестэрне «Блуберы».
**02.40** Драматычны трылер «Груз 200».

EUROSPORT

**09.30** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг. Часопіс.
**10.00** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Ансі. Францыя. Этап 18. Агляд.
**11.00** Плаванне. Чэмпіянат свету. Скачкі ў ваду з трампліна. Мужчыны. 3 м. Фінал. Рым (Італія).
**12.00** Футбол. Чэмпіянат Еўропы да 19 гадоў. Групавы этап. Украіна - Славенія. Украіна.
**13.00** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Ансі. Францыя. Этап 18.
**14.00** Плаванне. Чэмпіянат свету. Сінхронныя скачкі ў ваду з трампліна. Мужчыны. 10 м. Рым (Італія).
**15.45** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Бургуан-Жалье - Абена. Францыя. Этап 19.
**18.30** Футбол. Чэмпіянат Еўропы да 19 гадоў. Групавы этап. Іспанія - Сербія. Украіна.
**20.30** Футбол. Чэмпіянат Еўропы да 19 гадоў. Групавы этап. Украіна – Англія- Украіна.
**21.30** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Навіны.
**21.45** Плаванне. Чэмпіянат свету. Сінхронныя скачкі ў ваду з трампліна. Жанчыны. 3 м. Фінал. Рым (Італія).
**23.00** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Бургуан-Жалье - Абена. Францыя. Этап 19. Агляд.
**00.00** Наймоцныя людзі планеты. Ліга чэмпіёнаў. Нідэрланды.
**01.00** «Формула-1». Часопіс.
**01.30** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Бургуан-Жалье - Абена. Францыя. Этап 19.

БЕЛСАТ tv BELSAT

**19.00** Аб'ектыў.
**19.05** Дакументальная гадзіна: «Рускае шчасце», дак. фільм, рэж. Юрый Хашчавацкі.
**20.00** Еўрапейскі Саюз без сакрэтаў, 5 серыя: «Энергетычная бяспека».
**20.20** Побач з намі.
**20.35** Госць «Белсату»: Стэфан Эрыксан – амбасадар Швецыі ў Рэспубліцы Беларусь.
**20.50** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Ягайла».
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** «Павернуты», маст. фільм, рэж. Казімеж Куц, 1994 г., Польшча.
**22.40** Аб'ектыў.

## 25 ЛІПЕНЯ, СУБОТА

**06.20** Моладзевы серыял «Сэрца акіяна» (Францыя).
**06.45** Брытва Аккама.
**07.15** Існасць.
**07.40** Дзень спорту.
**07.50** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**08.45** Гатуем разам.
**08.55, 12.15** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.00, 12.00, 15.00, 18.00** Навіны.
**09.05** Здароўе.
**09.35** Серыял «Як сказаў Джым» (ЗША).
**10.20** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна). Фільм «Ірына Понароўская».
**11.10** Ранішняя хваля.
**11.45** «OFF STAGE LIFE» з Сяргеем Епіхавым.
**12.20** Залатая калекцыя савецкага кінематографа. «Каліна чырвоная» (СССР).
**14.20** «У чаканні Мундзіяля». Дзённік чэмпіянату свету па футболе-2010.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Вакол планеты.
**16.10** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**16.35** «Украіна: 25-ы кадр». Відэафільм АТН.
**17.00** Дакументальны цыкл «Зорнае жыццё» (Расія). Фільм «Зоркі і машыны».
**17.45** Відэафільм АТН «Пад Крычаўскім ветразем» цыкла «Зямля беларуская».
**18.25** «Ваша лато».
**19.15** Латарэя «Пяцёрачка».
**19.30** «Жывая Бьёрк». Канцэрт (Аўстралія).
**21.00** Панарама.
**21.40** Фільм тыдня. Рамантычная камедыя «Двойчы ўчора» (ЗША - Германія - Вялікабрытанія).
**23.30** Уласнай персонай.
**00.00** Чэмпіянат свету па аўтагонках «Формула-1». Гран-пры Венгрыі. Кваліфікацыя.

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Суботняя раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** «Шчаслівыя разам». Камедыйны серыял.
**09.40** «Здароўе».
**10.25** «Смак».
**11.05** Мультфільм. «Канікулы ў Праставкашына».
**11.55** Камедыя Эльдара Разанава «Гараж».
**13.45** «Васіль Шукшын. «Пакліч мяне ў далеч светлую».
**14.45** АНТ прадстаўляе: «Бітва гарадоў».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** «Васіль Шукшын. Чалавек зямлі».
**17.50** АНТ прадстаўляе: «Футбол. Чэмпіянат Еўропы сярод жаночых каманд да 19 гадоў. Фінал». Прамая трансляцыя.
**19.55** Тэорыя неверагоднасці. «Йога».
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Памяці Уладзіміра Высоцкага. «Свая каляіна».
**22.55** Харысан Форд у фільме «Павуцінне хлусні» да 01.15.

**06.30** «Анфас».
**06.45** «Турысты». Камедыйны серыял.
**07.30** «Сямейнае кіно»: «У пошуках капітана Гранта». СССР, 1985 г. 3-я і 4-я серыі.
**09.40** «Я - вандроўца».
**10.05** «Крокі да поспеху» з Алінай Кабаевай.
**10.55** «Мінск і мінчукі».
**11.30** «Новыя вандраванні дылетанта».
**12.00** «Салдаты. Залатыя серыі».
**14.50** «Дарагая перадача».
**15.15** «Рэальны спорт».
**15.30** «Ваенная таямніца» з Ігарам Пракапенкам.
**16.20** «Наша справа».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.40** Агляд міжнароднага шоу-бізнэсу.
**17.20** «Рэпарцёр СТБ». Лепшае.
**17.50** «Малая Радзіма». Ваўкавыск.
**18.20** «Залатая калекцыя»: «Супрацьстаянне». СССР, 1985 г. Заключная серыя.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** «Сусветны блокбастар»: «Здані Гойі». ЗША-Іспанія, 2006г.
**22.15** «Міхаіл Задорнаў. Адказ рабром».
**23.40** «Арт-хаўс»: фільм рэжысёра Ізабель Кайшэт «Таемнае жыццё слоў». Іспанія, 2005г.
**01.30** «Уцёкі». Серыял.

**08.10** Мультсерыял «Мышка Марго» (Вялікабрытанія).
**08.30** Дакументальна-пазнавальны серыял «Новыя храмы дзікай прыроды» (Францыя).
**09.00** Фантастычны серыял «Філ з будучыні» (ЗША).
**09.50** Таемны гусt.
**10.20** Школа рамонту.
**11.20** Невытлумачальна, але факт.
**12.20** «Лабірынты: зачараваныя замкі паноў Горват».
**12.50** Гісторыка-біяграфічная драма «Пушкін. Апошняя дуэль» (Расія).
**14.45** Музычная моладзевая камедыя «Група «Дзяўчынкі гепарда» (Канада-ЗША).
**16.20** Прэм'ера. Рамантычная камедыя «Дом, мілы дом» (Расія).
**18.00** Дакументальна-пазнавальны фільм «Сакрэты Чынгісхана» (ЗША). 1-я серыя.
**18.50** Меладрама «Пачаць спачатку. Марта» (Украіна). 1-4, заключная, серыі.
**22.05** Рамантычная камедыя «Прадаўшчыца» (ЗША-Вялікабрытанія).
**00.00** Казанова.

РОССИЯ

**07.00** Весткі.
**07.15** «За сям'ю пячаткамі».
**07.50** Мультфільмы.
**08.15** «Вандраванні натураліста».
**08.45** «Ранішняя пошта» з Юрыем Мікалаевым і Ларысай Грыбалёвай».
**09.20** Фільм «24-25» не вяртаецца».
**11.00** Весткі.
**11.15** Пакой смеху.
**12.05** Лірычная камедыя «Амаль смешная гісторыя». 1-я серыя.
**13.25** «Відавочнае-неверагоднае».
**14.00** Весткі.
**14.15** Алена Якаўлева ў тэлесерыяле «Каменская».
**15.20** Да 80-годдзя з Дня нараджэння. Прэм'ера. «Ён ваяваў за Радзіму. Васіль Шукшын». Дакументальны фільм.
**16.15** Фільм «Гонка з пераследам».
**18.00** «Смехапанарама Яўгенія Петрасяна»
**19.00** Весткі ў суботу.
**19.20** «Суботні вечар».
**21.15** Меладрама «Шчасце па рэцэпце», Расія, 2006 г.
**00.30** Вострасюжэтны фільм «Трэці лішні», Расія, 2007 г.
**02.20** Заканчэнне эфіру.

НТВ

**07.35** «Казкі Бажэнава».
**08.00** Сёння.
**08.20** Мультфільмы.
**08.55** «Агляд».
**09.25** «Без рэцэпту».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Галоўная дарога».
**10.55** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Асабліва небяспечны!».
**14.05** Баявік «Наймоцны ўдар».
**16.00** Сёння.
**16.20** «Рэпарцёр А. Зіненка.» Лепшыя фільмы.
**17.10** Дэтэктыўны серыял «Закон і парадак. Аддзел аператыўных расследаванняў».
**19.00** Сёння.
**19.30** Самыя гучныя «Рускія сенсацыі»: «Як запальваліся зоркі». «Перамагчы рак».
**21.15** «Ты не паверыш!».
**22.15** Андрэй Федарцоў у баявіку «Толькі наперад».
**00.05** Рамантычная моладзевая камедыя «У пагоне за Эмі».

EUROSPORT

**09.30** «Формула-1». Часопіс.
**10.00** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Бургуан-Жалье - Абена. Францыя. Этап 19. Агляд.
**11.00** Футбол. Чэмпіянат Еўропы да 19 гадоў. Групавы этап. Украіна.
**12.30** «Формула-1». Часопіс.
**13.00** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Бургуан-Жалье - Абена. Францыя. Этап 19.
**14.30** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Мантэлімар - Мон-Венту. Францыя. Этап 20.
**17.45** Футбол. Чэмпіянат Еўропы да 19 гадоў. Жанчыны. Беларусь. Фінал.
**20.00** Плаванне. Чэмпіянат свету. Сінхронныя скачкі ў ваду з трампліна. Мужчыны. 10 м. Фінал. Рым (Італія).
**21.00** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Навіны.
**21.15** Бокс. Міжнародны турнір. Сярэдняя важкіца катэгорыя. Джон Даддзі (Вялікабрытанія) - Білі Лілл (ЗША). ЗША.
**23.00** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Мантэлімар - Мон-Венту. Францыя. Этап 20. Агляд.
**00.00** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб.
**01.30** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Мантэлімар - Мон-Венту. Францыя. Этап 20.

БЕЛСАТ tv BELSAT

**19.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.05** МакраФон: «Басовішча-2008»: канцэрт гурта «Neuro Dubel».
**19.50** Чалавек-эпоха: «Сталін. Смерць дыктатара», дак. фільм, рэж. Гэльг Трамперт, Інга Вольфрам, 2003 г., Германія.
**20.50** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Крыжакі» (пазнавальная праграма).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.10** Еўропа сёння.
**21.40** «Дэтэрмінатар», серыял: 3 серыя.
**22.25** Жаўтуха (сатырычная праграма).
**22.50** Аб'ектыў.

## 26 ЛІПЕНЯ, НЯДЗЕЛЯ

**07.40** Моладзевы серыял «Сэрца акіяна» (Францыя).
**08.30** Альманах вандраванняў.
**09.00, 12.00, 14.25** Навіны.
**09.10, 13.35** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.15** Арсенал.
**09.40** Камедыйны серыял «Як сказаў Джым» (ЗША).
**10.25** Культурныя людзі.
**10.55** «Усе стыхіі».
**11.25** У свеце матораў.
**12.10** Залатая калекцыя савецкага кінематографа. Лірычная камедыя «Дамы запрашаюць кавалераў» (СССР).
**13.40** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**13.55** Nota Bene.
**14.35** Навіны рэгіёна.
**14.55** Чэмпіянат свету па аўтагонках «Формула-1». Гран-пры Венгрыіі. Гонка. Прамая трансляцыя.
**16.55** Фантастычны серыял «Паверхня» (ЗША). Заключная серыя.
**17.50** Суперлато.
**18.45** Меладрама «Свая чужая сястра» (Расія).
**20.35** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоу.
**21.00** «Панарама тыдня» з Максімам Кароткіным.
**22.05** Іранічная меладрама «Прыгожыя дзяўчыны» (ЗША).

---

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь.
**09.20** «Шчаслівыя разам». Камедыйны серыял.
**09.50** «Шалапутныя нататкі» з Дзмітрыем Крыловым.
**10.10** Пакуль усе дома.
**11.00** Фазэнда.
**11.35** «Эмігранты. Шлях дадому».
**12.35** Нядзельны «Ералаш».
**13.00** Прэм'ера. «Скарб нацы».
**14.00** Васіль Шукшын у фільме «Каліна чырвоная».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Прэм'ера. «Марыя Шукшына. Распавядзіце мне аб маім бацьку».
**17.35** «КВЗ». Прэм'ер-ліга.
**19.10** АНТ прадстаўляе: «Рэкламная паўза».
**20.00** Контуры.
**21.05** «Вясковая камедыя».
**22.10** «Вялікая розніца».
**23.10** «У краіне жанчын» да 01.00.

---

**06.50** «Праверана на сабе».
**07.35** «Турысты». Камедыйны серыял.
**08.25** «Сямейнае кіно»: «У пошуках капітана Гранта». СССР, 1985г. 5-я серыі.
**09.30** «Дабры дзень, доктар!».
**10.00** «Відавочца прадстаўляе: самае смешнае».
**10.55** «Вялікі сняданак».
**11.30** «Аўтапанарама».
**12.00** «Салдаты. Залатыя серыі».
**14.50** «Дарагая перадача».
**15.00** «Культурнае жыццё» з Аляксандрам Ефрэмавым.
**15.30** Дыялогі аб музыцы.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Асабістая цікавасць» з Паўлам Каранеўскім.
**17.15** «Аўтапанарама».
**17.45** «Кіно»: «Прывітанне, маляня!». Расія, 2001г.
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.30** «Фільм тыдня»: «Пакой Марвіна». ЗША, 1996г.
**22.25** «Спартовы тыдзень».
**22.50** Чэмпіянат Еўропы па веласпорце на трэку-2009г.
**00.20** «Уцёкі». Серыял.

---

**08.25** Мір вашаму дому.
**08.35** Мультсерыял «Мышка Марго» (Вялікабрытанія).
**08.55** Фантастычны серыял «Філ з будучыні» (ЗША).
**10.10** Фільм-казка «Стары Хатабыч» (СССР).
**11.30** Медычныя таямніцы з доктарам А.Цярэшчанкам.
**12.05** Пасоўванне +.
**12.25** Меладрама «Дзікі сабака Дзінга» (СССР).
**14.00** Музычная моладзевая камедыя «Група «Дзяўчынкі гепарда-2» (ЗША).
**15.45** Камедыйны серыял «Дурнушка Бэцці-2» (ЗША).
**16.35** Дакументальна-пазнавальны фільм «Сакрэты Чынгісхана» (ЗША). 2-я серыя, заключная.
**17.25** Гістарычная драма «Зорка чароўнага шчасця» (СССР). 1-я і 2-я серыі.
**20.20** Тэлебарометр.
**20.40** Экспедыцыя.
**21.10** Вялікае сэрца.
**21.35** Дэтэктыўны трылер «Вінаваты» (Вялікабрытанія - ЗША - Канада).
**23.35** «Правы чалавека». Аўтарская праграма Яўгенія Новікава.
**23.50** Свая музыка.

---

РОССИЯ

**07.00** Меладрама «Адзін радок».
**08.40** «Гонка з пераследам».
**10.10** «Мой срэбны шар. Фрэнк Сінатра». вядучы - Віталь Вульф.
**11.00** Весткі.
**11.15** «Сам сабе рэжысёр».
**12.10** «Амаль смешная гісторыя». 2-я серыя.
**13.30** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**14.00** Весткі.
**14.15** Алена Якаўлева ў тэлесерыяле «Каменская».
**15.15** Уладзімір Герасімаў, Святлана Сухавей, Сяргей Праханаў і Уладзімір Іллін у фільме «Вясёлы калейдаскоп».
**17.00** «Смяяцца дазваляецца». Гумарыстычная праграма.
**19.00** Весткі.
**19.20** «Сумленны дэтэктыў». Аўтарская праграма Эдуарда Пятрова.
**20.00** Фільм «Прысуд», Расія, 2008 г.
**21.55** «Мы дзіўна сустрэліся», Расія, 2007 г.
**23.35** «На чужым свяце».
**00.55** Заканчэнне эфіру.

---

НТВ

**07.40** Мультфільм.
**08.00** Сёння.
**08.15** «Дзікі мір» з Цімафеем Бажэнавым.
**08.45** «Іх норавы».
**09.25** « Ядзім дома!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Выратавальнікі».
**10.50** «Авіятары».
**11.25** «Змаганне за ўласнасць».
**11.55** «Дачны адказ».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Жонкі Высоцкага».
**14.15** Баявік «Наймоцны удар-2».
**16.00** Сёння.
**16.20** «Рэпарцёр А. Зіненка». Лепшыя фільмы.
**17.10** Дэтэктыўны серыял «Закон і парадак. Злачынны намер».
**19.00** Сёння. Адмысловы выпуск. Гутарка з Прэзідэнтам Расіі.
**19.55** Вострасюжэтны серыял «Ганчакі: Покер на чатырох тузах».
**23.55** Футбольная ноч.
**00.20** «Пакаранне. Руская турма ўчора і сёння».

---

EUROSPORT

**09.30** Плаванне. Чэмпіянат свету. Сінхронныя скачкі ў ваду з трампліна. Мужчыны. 10 м. Фінал. Рым (Італія).
**10.00** Плаванне. Чэмпіянат свету. Рым. Дзень 1.
**13.00** Супербайк. Чэмпіянат свету. Чэхія. Заезд 1.
**14.00** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Мантэлімар - Мон-Венту. Францыя. Этап 20. Агляд.
**14.30** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Мантэро Фо-Йонн - Парыж. Францыя. Этап 21.
**19.00** Плаванне. Чэмпіянат свету. Рым. Дзень 1.
**21.00** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Навіны.
**21.15** Супербайк. Чэмпіянат свету. Чэхія. Заезд 2.
**22.00** Суперспорт. Чэмпіянат свету. Чэхія.
**22.30** Матаспартовы часопіс.
**23.00** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Мантэро Фо-Йонн - Парыж. Францыя. Этап 21. Агляд.
**23.30** Аўтаспорт. Міжнародная формула мастерс. Будапешт (Вугоршчына).
**00.00** Тэніс. Турнір АТР. Індыянапаліс (ЗША). Фінал.
**01.15** Плаванне. Чэмпіянат свету. Рым. Дзень 1.
**02.00** Матаспартовы часопіс.

---

БЕЛСАТ tv BELSAT

**19.00** Прэс-экспрэс (агляд медыяў)
**19.15** «Элі Макбіл», тэлесерыял: V сезон, 11 серыя
**20.05** МакраФон: «Minsk-Mixt–2008», ч. 5: канцэрт гурта «Ветах»
**20.20** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Партызанская школа», дак. фільм, рэж. Юрый Каліна, 2002 г., Польшча
**20.50** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Вітаўт» (пазнавальная праграма).
**21.00** Аб'ектыў (вынікі тыдня)
**21.20** Акно ў Еўропу (інфармацыйная праграма)
**21.45** Фільматэка майстроў: «Несвядомыя», маст. фільм, рэж. Хаакін Арыстрэль, 2004 г., Іспанія–Германія–Партугалія–Італія.

---


# ШАНОЎНЫЯ ЧЫТАЧЫ!

**Газета «Новы час» працягвае падпіску на 2009 год. Падпісацца на выданне можна на перыяд ад 1 месяца да 1 года праз пошту або праз банк.**

### Падпіска на «Новы час» праз пошту

1. Выразаем купон.
2. На ПАШТОВЫМ ПЕРАВОДЗЕ пішам суму грашовага пераводу ў лічбах і прописам.
3. У графе «Ад каго» пішам прозвішча, імя, імя па бацьку.
4. Ніжэй указваем адрас.
5. Ідзем на бліжэйшае паштовае аддзяленне і здзяйсняем паштовы перавод.
6. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
7. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

Министерство связи и информатизации
Республики Беларусь
№ ____________ (по реестру ф. 11)
№ ____________ (по реестру ф. 10)

ИСПРАВЛЕНИЯ НЕ ДОПУСКАЮТСЯ

ПРИЕМ

Предоплата за доставку г-ты "Новы час"

| Наименование предприятия связи, к - гербовая печать | Календарный шт. места подачи | № по ф. 5 | Сумма, вид услуги, подпись оператора |
|---|---|---|---|

ПОЧТОВЫЙ ПЕРЕВОД на ____________________ руб.

(сумма прописью)

Кому Куда Г-та "Новы час", р/с 3012211080010 фил. МГДОАО "Белинвестбанк", код 153001764, УНН 190790926 г. Минск, ул. Коллекторная,11

От кого ____________________

Адрес ____________________

(почтовый индекс и подробный адрес)

### Падпіска на «Новы час» праз банк

1. Выразаем купон.
2. Пішам прозвішча, імя, імя па бацьку і адрас.
3. Указваем суму аплаты.
4. Ідзем у адзяленне банка і здзяйсняем пералік грошай.
5. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
6. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

ИЗВЕЩЕНИЕ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
МГД ОАО «Белинвестбанк» г. Минск
(наименование банка)
Счет получателя 3012211080010 Лицевой счет Код 764
УНП* 190790926
(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|

Период подписки указывает абонент
Плательщик
Пеня
Кассир Всего

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
МГД ОАО «Белинвестбанк» г. Минск
(наименование банка)
Счет получателя 3012211080010 Лицевой счет Код 764
УНП* 190790926
(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|

Период подписки указывает абонент
Плательщик
Пеня
Кассир Всего

ЦІКАВА

# ПОЛЬСКІ АНАЛАГ ДАХАУ

Іван БІЧ

**75 гадоў таму ў Бярозе-Картузскай на тэрыторыі Заходняй Беларусі, якая ўваходзіла ў склад Польшчы, пачала працаваць турма для палітычнай апазіцыі.**

Ідэя стварыць спецыяльную турму для палітычных праціўнікаў дзяржавы прыйшла ў галаву тагачаснаму прэм'еру Польшчы Казлоўскаму. За прыклад узялі Дахау — пабудаваны нацыстамі канцлагер для самых небяспечных палітычных апанентаў Гітлера.

Казлоўскі нават не хаваў, што менавіта нацысцкая сістэма пакарання натхніла яго на гэты крок. Больш таго, ён быў заўзятым фанатам Гебельса і ўвесь час цытаваў ягоныя разважанні наконт ролі турэмных устаноў у падтрыманні палітычнай стабільнасці. Захапленне Казлоўскага фашызмам не знікла нават пасля таго, як немцы акупавалі Польшчу. У часы вайны ён стаў лідэрам руху калабарацыяністаў. Казлоўскі асабіста абіваў парогі кабінетаў у Берліне, лабіруючы праект стварэння марыянетачнага ўраду на тэрыторыі захопленай немцамі Польшчы. Даведаўшыся пра гэта, польскі эміграцыйны ўрад у Лондане вынес Казлоўскаму смяротны прысуд.

Нарэшце, ідэя стварэння канцлагеру цудоўна пасавала тагачаснай палітычнай атмасферы. У Польшчы панаваў рэжым санацыі, былі значна абмежаваныя палітычныя свабоды.

Непасрэднай падставай для будаўніцтва польскага Дахау стаў тэрарыстычны акт у Варшаве 15 чэрвеня 1934 года. Украінскі нацыяналіст застрэліў міністра ўнутраных спраў Польшчы Браніслава Перацкага. Забойца быў сябрам Арганізацыі ўкраінскіх нацыяналістаў (АУН), якой кіраваў Сцяпан Бандэра.

Казлоўскі адразу прапанаваў Пілсудскаму праект супертурмы. Апошні быў вельмі ўражаны забойствам Перацкага, якога лічыў адным з самых блізкіх да сябе людзей. У той жа дзень быў падпісаны адпаведны дакумент, які дазваляў у мэтах абароны грамадскага спакою папярэдняя арышты і ўтрыманне ў спецыяльнай турме небяспечных асобаў. Турма павінна была знаходзіцца ў Бярозе-Картузскай. Пазней гісторыкі ўстанавілі, што тэкст дакумента быў папросту скалькаваны з нямецкага закона пра турэмную зону ў Дахау.

Карпусамі бярозаўскай турмы сталі старыя казармы царскай арміі. Вакол быў выкапаны роў з вадой і пастаўлены плот з калючага дроту. Па дроту быў пушчаны электрычны ток.

Фармальна аб'ект у Бярозе-Картузскай належаў Міністэрству ўнутраных спраў. Аднак




Некралог Браніслава Перацкага і яго забойца Рыгор Мацейка



Савецкі абеліск на месцы былога канцлагера ў 1962 годзе

фактычна ён падпарадкаваўся ваяводзе Палескаму. Спецыяльна з нагоды адкрыцця турмы быў зменены ваявода. Новым рэгіянальным кіраўніком быў прызначаны былы камендант Брэсцкай крэпасці. Костэк-Бернарскі меў рэнаме сапраўднага садыста. Больш таго, кіраўніцтва МУС правяло спецыяльны конкурс сярод сваіх супрацоўнікаў і выбрала самых брутальных паліцэйскіх. Некаторым злачынцам, якія сядзелі за кратамі, прапанавалі амністыю, калі яны пагодзяцца служыць наглядчыкамі ў Бярозе-Картузскай. Камендантамі лагера былі спачатку Баляслаў Грэфнер, а потым Йозэф Камала. Лёс апошняга склаўся вельмі цікава. Як польскага афіцэра падчас вайны немцы яго арыштавалі і адправілі ў Асвенцім. Там яго забілі ахоўнікі ўкраінскага паходжання, якія такім чынам адпомсцілі за катаванне ўкраінскіх палітвязняў, якія сядзелі ў Бярозе-Картузскай.

Увогуле, трапіць у лагер было вельмі лёгка. Рашэнне пра адпраўку грамадзяніна ў Бярозу-Картузскую прымаў не суд, а следчы. Пры гэтым грамадзянін не меў магчымасці скардзіцца на такое рашэнне ў суд. Праўда, следчы мог засадзіць чалавека толькі на тры месяцы. Пасля камендант турмы павінен быў вынесці прысуд, колькі гэты вязень павінен заставацца за кратамі.

7 ліпеня 1934 года ў Бярозу-Картузскую даставілі першага вязня. На восень 1939 года, калі турма была ліквідаваная Чырвонай арміяй, што ўвайшла на тэрыторыю Заходняй Беларусі, тут сядзелі некалькі тысяч чалавек розных нацый і розных палітычных поглядаў. Сярод іх былі таксама і жанчыны.

На гэты час у турме ўжо існавалі пэўныя традыцыі. Як толькі новы вязень прыбываў у Бярозу-Картузскую, яго добра збівалі, каб ведаў, куды трапіў. Пасля яму давалі нумар і вялі ў ягоную маленькую камеру. Наглядальнікі патрабавалі, каб вязень стаяў цэлы дзень каля сцяны, а спаў на голай падлозе. Прычым перад адбоем падлогу палівалі вадой. Уначы вязняў часта падымалі і прымушалі бегаць па дварах.

Дзень у турме пачынаўся а 4-й гадзіне раніцы. За дзесяць секунд вязень мусіў памыцца і схадзіць у прыбіральню. Пасля быў сняданак — кава і чорны хлеб. Затым пачыналася муштра: вязні хадзілі цэлы дзень па двару ў калонах. Ахоўнікі пры гэтым актыўна падганялі іх палкавымі ўдарамі. Іншая форма занятку вязняў — бессэнсоўнае нашэнне туды-сюды камянёў. Усё пад брэх службовых сабак. Цікава праходзілі ў Бярозе-Картузскай выходныя. У нядзелю вязні не працавалі і не маршыравалі. Яны мусілі слухаць каталіцкага капелана (гэта вельмі не падабалася грэка-каталікам, праваслаўным, яўрэям і сацыялістам) і чытаць працы Юзэфа Пілсудскага.

Нельга сказаць, што польскае грамадства маўчала. Выпадкі смерці ў лагеры выклікалі рэакцыю ў прэсе. Напрыклад, справа вязня Маларовіча, які сваёй крывёй напісаў на сценах камеры: «Ганьба фашысцкім катам!». За гэта яго збілі і кінулі ў карцэр, адкуль ён выйшаў вар'ятам. Увогуле, у Бярозе-Картузскай было забіта 20 чалавек. Але гэта афіцыйная лічба. Прыкладна 60 чалавек сталі калекамі. Іх адпраўлялі ў шпіталь у Кобрыне.

Лагер працаваў, як было сказана вышэй, да 1939 года, калі ў Бярозу ўвайшлі чырвонаармейцы. Яны выпусцілі ўсіх вязняў. Сярод якіх, дарэчы, былі правыя польскія палітыкі і сябры АУН — будучыя ворагі саветаў. Затое чырвоныя арыштавалі ўсіх польскіх афіцэраў, якіх потым забілі ў катынскім лесе.

Вось такая іронія гісторыі.




## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Знешнепалітычны курс Лукашэнкі на саюз з Расіяй завяршыўся крахам. Беларускі прэзідэнт не здолеў своечасова зразумець, што расійскай палітычнай эліце (прыкладна з 2003 года) патрэбны не саюзнік, а падначалены, кіруючы якім яна магла б дэманстраваць ЗША і ЕС сваю магутнасць. Пры гэтым расійская ўлада сур'ёзна патрабуе ад беларускага ўрада перадаць дзяржаўныя прадпрыемствы расійскім карпарацыям. Гэта найбольш надзейная гарантыя таго, што Беларусь і ў выпадку замены Лукашэнкі, які, як вядома, шмат каго раздражняе ў расійскім кіраўніцтве, застанецца пад кантролем расійскай улады. Адмова Лукашэнкі прывяла да канфрантацыі і да санкцый з расійскага боку, якія могуць падаць недарэчнымі толькі для тых, хто сур'ёзна верыць, нібыта расійская эліта імкнецца да аднаўлення СССР. У яе іншыя мэты, і Лукашэнка, падобна, у гэтым канчаткова пераканаўся. А яшчэ праз некалькі гадоў цяперашні рэжым непазбежна апынецца ў канфлікце з Расіяй. Але, мяркуючы па ўсім, так доўга ён не пратрымаецца.

**Каспаров.Ru (Расія)**

Малаверагодна, што наяўнасць АЭС памяншыць энергетычную залежнасць Беларусі ад Расіі, бо менавіта там давядзецца закупляць ядзернае паліва, якога ў 2016–2018 гадах у Расіі не будзе шмат, так што не выключана падвышэнне коштаў. Нават у расійскіх калідорах улады часам гучаць сумневы, а ці патрэбна АЭС Беларусі, калі краіна можа атрымліваць электраэнергію са Смаленскай АЭС. «Росатам» падтрымлівае новы беларускі праект. Аднак у цэлым пытанне пра тое, ці трэба будаваць станцыю, працягвае заставацца адкрытым.

**«Geopolitika» (Літва)**

Ціск Масквы на Мінск з кожным разам набывае ўсе больш жорсткія формы. Аднак, да гонару прэзідэнта, дагэтуль ніводны расійскі рычаг так і не спрацаваў. Лукашэнка, цвёроза ацэньваючы сітуацыю, не дае ёй выходзіць з-пад уласнага кантролю, дэманструючы пры гэтым «старэйшым крамлёўскім братам» незвычайныя здольнасці празорлівага палітычнага акцёра. Радуе і тое, што на гэтым полі, дзе мускуламі нас спрабуюць страшыць «старэйшыя браты», мы — не адзіныя змагары.

**«Грузія online» (Грузія)**

Спрабуючы гуляць на супярэчнасцях з Масквой, беларускі прэзідэнт паслядоўна руйнуе аснову свайго кіравання, якая ўяўляе сукупнасць сталых фінансавых уліванняў у беларускую эканоміку і антызаходнюю прапаганду. Пазбавіўшыся гэтых рычагоў кіравання сацыяльнымі працэсамі ў краіне, А. Лукашэнка будзе без асаблівых высілкаў (пры ўдзеле Вашынгтона і Брусэля) заменены на празаходняга дзеяча. Тым самым, будзе адхілены апошні геапалітычны саюзнік Расіі на заходнім кірунку, з усімі вынікаючымі ваенна-палітычнымі і эканамічнымі перавагамі для ЗША і іх саюзнікаў па NATO.

**«Час-пик» (Расія)**

Магчыма, Лукашэнка адчувае, што яму ўсё ж давядзецца наладжваць адносіны з раздражнёным Крамлём. Нягледзячы на тое, што Беларусь нядаўна далучылася да праекта ЕС «Усходняе партнёрства», яна, аднак, падтрымлівае абмежаваныя сувязі з Захадам. Беларусь усё ж моцна залежыць ад Расіі з-за танных крэдытаў, недарагіх энергарэсурсаў і жыццёва важных гандлёвых сувязяў.

**«Подробности» (Украіна)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### АЎСТРЫЯ. СПРАВА БОРАТА

Аўстрыя давяла, што годная назвы «краіна шпіёнаў». Менавіта так называлі яе ў часы «халоднай вайны» з-за пазаблокавага, нейтральнага статусу. Новы шпіёнскі скандал звязаны з Рахатам Аліевым, былым зяцем казахскага прэзідэнта Нурсултана Назарбаева. Як вядома, з 2007 года Рахат хаваецца ад казахскіх спецслужбаў у Вене, скідваючы на кіраўніка Казахстана плынь кампрамату праз інтэрнэт. Назарбаеў адказваў яму той жа манетай. Напрыклад, у сеціве рэгулярна з'яўлялася інфармацыя пра інтымнае жыццё Аліева. Казахскія палітолагі не маглі зразумець, адкуль у казахскіх уладаў такая інфармацыя. Цяпер, здаецца, адказ знойдзены. Ёсць падазрэнне, што кампрамат казахам перадаваў дэпутат праварадыкальнай Партыі свабоды (FPO) Харальд Вілімскі. Як сябра парламента, ён меў права праглядаць сакрэтныя матэрыялы паліцыі, якая ў мэтах бяспекі Аліева ўвесь час за ім сочыць. Самае цікавае, што Вілімскі фактычна выдаў сам сябе. Зрабіў дэпутацкі запыт: чаму Аліеў жыве ў Аўстрыі? Пытанне перадалі ў МУС, якое паведаміла, што Вілімскі даўно цікавіцца Аліевым. Цяпер усе чакаюць спецыяльнага даклада пра Бората — так празвала агента казахаў аўстрыйская прэса.

**Па матэрыялах «Der Standart» (Аўстрыя)**

### ГЕРМАНІЯ. ТЭРАРЫСТЫ СКЛАЛІ ЗБРОЮ

Восем гадоў таму ў крымінальных хроніках з'явілася тэрарыстычныя арганізацыя «Вайсковая група». Мелася на ўвазе група левых радыкалаў, якія займаліся падпаламі розных дзяржаўных установаў і нападамі на іх супрацоўнікаў. У сваіх заявах яны абяцалі, што будуць нішчыць дзяржаўную нерухомасць і збіваць функцыянераў да таго самага дня, пакуль Германія не стане сацыялістычнай рэспублікай саветаў. Паліцыя арыштавала частку экстрэмістаў, аднак некаторыя актывісты да гэтага часу гуляюць на волі. І вось зараз нечакана пракуратура атрымала ліст ад сяброў «Вайсковай групы», якія пішуць, што прыпыняюць тэрарыстычную актыўнасць. Сваё рашэнне аўтары тлумачаць тым, што гвалт — гэта дрэнна. Пракуратура заяву тэрарыстаў вітала, аднак следства па «Вайсковай групе» пакуль не прыпыніла. Застаецца дадаць, што ў прэсе былі артыкулы пра тое, што ядро групы складаюць былыя супрацоўнікі ўсходненямецкай службы бяспекі.

**Па матэрыялах «Tageszeitung» (Германія)**

### КАНАДА. ЦЫГАНЕ ПАСВАРЫЛІ ЧЭХАЎ І КАНАДЦАЎ



Афіцыйная Атава выканала сваю пагрозу — скасавала бязвізавы рэжым для чэхаў. Канадцаў дасталі чэшскія цыгане, якія касякамі бягуць з Чэхіі і просяць канадскае грамадзянства. Прычына эміграцыі — пераслед цыган у Чэхіі з боку нацыстаў. Чэшскія нацысты абвясцілі нешта кшталту кампаніі вынішчэння прадстаўнікоў гэтай этнічнай групы. Толькі за адзін год у Канаду перабралася дзве з паловай тысячы цыган. Прага факт дыскрымінацыі ўпарта адмаўляла. У адказ тры тыдні таму Канада паставіла чэхам ультыматум: або нешта зрабіце, або ўвядзем візы. Чэшскі МЗС пагрозу праігнараваў, і ў выніку канадцы ўвялі візавы рэжым. Чэхія вельмі абурылася. Яна адклікала свайго пасла і заявіла, што канадцы больш ім не саюзнікі. Цікава, але жыхары ўсіх іншых краін шэнгенскай зоны могуць і далей ездзіць у краіну кляновага ліста без візы. Гэта дае чэхам падставу скардзіцца на канадцаў у еўрапейскія структуры.

**Па матэрыялах «Dzennik» (Польшча)**

### ЛІТВА. МАГЧЫМА ЎВЯДЗЕННЕ ЦЭНЗУРЫ



Дэпутаты парламента пераадолелі вета, раней накладзенае прэзідэнтам Літвы, і прынялі закон «Пра абарону непаўналетніх ад негатыўнай інфармацыі». Крытыкі новаўвядзення кажуць, што закон фактычна стварае аснову для ўвядзення ў краіне маштабнай цэнзуры. Улады атрымліваюць магчымасць падвяргаць цэнзуры любыя матэрыялы, у якіх «фігуруе гомасексуалізм, бісексуальнасць, палігамія, а таксама ўтрымліваюцца сцэны гвалту і смерці». Паводле новых правілаў, будуць забароненыя матэрыялы, якія «заахвочваюць да ўдзелу ў азартных гульнях і латарэях», «прапагандуюць няправільнае харчаванне, незахаванне гігіены і пасіўны лад жыцця», а таксама «прапануюць верыць у паранармальныя з'явы і гіпноз». За законапраект прагаласавалі 87 з 141 дэпутата. Супраць былі толькі шэсць дэпутатаў. 25 устрымаліся.

**Па матэрыялах BBC**

ПРАТЭСТ

# БАЛКАНІЗАЦЫЯ ПА-КІТАЙСКУ

*Алег НОВІКАЎ*



**Падзеі ва Урумчы яскрава прадэманстравалі крах мадэлі нацыянальнай палітыкі Кітайскай народнай рэспублікі.**

Не маюць рацыі тыя кітайскія функцыянеры, якія кусаюць локці з-за таго, што ў пачатку ліпеня пусцілі на самацёк інцыдэнт у мясцовасці Сіньцзянь, дзе кітайскія рабочыя арганізавалі суд Лінча над уйгурам, які, у сваю чаргу, быццам учыніў гвалт з нейкага кітайца. Таго уйгура кітайцы забілі, а паліцыя факт самасуду праігнаравала. Менавіта гэты выпадак і справакаваў выбух 4 ліпеня ва Урумчы, дзе натоўп уйгураў разграміў цэнтр горада, уступіў у бойку з сіламі аховы правапарадку (афіцыйныя вынікі — 184 забітых, неафіцыйныя — 600–800).

У кожнага, хто цікавіцца палітыкай, рэпартажы з Урумчы выклікаюць асацыяцыі з вясновымі пратэстамі ў Тыбеце. Сцэнары падзей вельмі падобныя (вулічныя пратэсты, бойкі з паліцыяй) і падобныя лозунгі — незалежнасць. Выснова, якую можна з гэтага зрабіць, — нацыянальная палітыка КНР буксуе.

Увогуле, у Кітаі жывуць 56 нацыянальных меншасцяў, ці каля 700 мільёнаў чалавек (прыкладна 6 працэнтаў ад агульнай колькасці насельніцтва краіны). Карэнных кітайцаў, або, як іх называюць, ханьцаў, — больш за 90 працэнтаў.

Народы былі ўключаныя ў склад Кітая рознымі шляхамі. Каго заваявалі (уйгуры), а хто сам спачатку заваяваў Кітай (маньчжуры або манголы). Так ці інакш, на момант абвяшчэння Кітайскай рэспублікі (1911 год) нацыянальнае пытанне было вельмі актуальным. Праўда, з улікам хаосу, які панаваў у краіне, да сістэмнай рэалізацыі нацыянальнай палітыкі справа не дайшла.

Па-іншаму вырашылі нацыянальнае пытанне ў Кітаі японцы, якія ў 1930-я гады пашырылі зону свайго ўплыву на паўночную частку краіны. Яны стварылі тут дзве марыянетачныя дзяржавы для манголаў і маньчжураў, якія былі прызнаныя шматлікімі краінамі, у тым ліку СССР. Дарэчы, японцы не прыдумалі нічога новага. Масква ў 1930–40-я гады спрабавала стварыць на тэрыторыі, дзе жывуць уйгуры, буферную дзяржаву Усходні Туркестан.

У 1949 годзе ў вайне з Чан Кайшы перамаглі камуністы, праграма якіх прадугледжвала пабудову сацыялістычнага Кітая на федэратыўных прынцыпах. Да гэтага, аднак, справа не дайшла: нацменшасці атрымалі толькі статус аўтаномных раёнаў. Асаблівая сітуацыя была ў Тыбеце, які першапачаткова меў поўную самастойнасць. Аднак пасля паўстання 1959 года, у выніку якога Далай Лама збег у Індыю, Тыбет таксама стаў толькі аўтаноміяй.

Аўтаноміі для нацменаў не сталі вырашэннем праблемы. Лепшы прыклад таму — падзеі 1962 года, калі быў зарэгістраваны самыя масавыя ў гісторыі добраахвотныя ўцёкі ў СССР. З-за голаду, выкліканага курсам Вялікага скачку, у Казахстан збегла 62 тысячы уйгураў.

Такім чынам, на пачатку XXI стагоддзя сітуацыя выглядае наступным чынам. Пяць народаў жывуць у аўтаномных раёнах, дзе іх мова, як і кітайская, мае афіцыйны статус. На мясцовых мовах друкуюцца ўсе прынятыя законы. Пяць моваў ёсць на дзяржаўных банкнотах. Босамі аддзелаў кампартыі ў тых раёнах абавязкова прызначаюцца тутэйшыя. Дзяржава больш-менш спрыяе развіццю нацыянальных культур.

Усё было б добра, калі б не эканамічны бум 1990-х гадоў, наступствам якога перш за ўсё стала масавая міграцыя ханьцаў з цэнтральнага і заходняга Кітаю на ўскраіны. Калі ў 1945 годзе уйгуры складалі 90 працэнтаў жыхароў аўтаноміі, то зараз — толькі 45, што, натуральна, выклікае ў іх незадавальненне.

Развіццё ўнутранага рынку КНР прывяло да росту попыту на спецыялістаў з добрым веданнем кітайскай мовы. Нацменам, які не маюць квотаў падчас конкурсаў на дзяржаўныя пасады, здаць моўны экзамен больш цяжка, чым этнічнаму кітайцу. У выніку яны выцясняюцца з эліты.

Трэці чыннік для незадавальнення — бурная эксплуатацыі карысных выкапняў у аўтаномных раёнах. Як правіла, прыбытак з гэтага атрымлівае цэнтр або кітайскія кампаніі. Добры прыклад — *Xinjiang Production and Corporation Group*, створаная з ініцыятывы дзяржавы грамадская арганізацыя, пад кантролем якой знаходзяцца ў тым ліку здабыча і продаж уйгурскіх газу і нафты. Толькі 6 працэнтаў сяброў арганізацыі уйгуры.

Згаданыя фактары, як лічаць эксперты, і прывялі да цяперашніх пратэстаў. Цікавай была рэакцыя Пекіна: кітайскія ўлады абралі іншую тактыку для барацьбы з сепаратыстамі, чым у Тыбеце. Яны не блакавалі інтэрнэт, а наадварот запрасілі на месца канфлікту замежных журналістаў. Такі падыход цалкам лагічны з улікам наступнай акалічнасці.

У адрозненні ад тыбетцаў, уйгурскім актывістам невядома слова «піяр». Далай Лама стаў іконай для заходніх праваабаронцаў, артыстаў Галівуда і бюргераў — фанатаў усходняй эзатэрыкі. А ў змагароў за незалежнасць Уйгурстану іміджавай палітыкі папросту няма. Больш таго, іх імідж вельмі не прывабны.

Рабія Кадыр — лідэр фракцыі уйгурскай эміграцыі, якая выступае за пабудову уйгурская дзяржавы па турэцкай мадэлі, не задае тон у палітычным уйгурскім дыскурсе. Між тым, вядома, што групоўка Мусульманскі рух Усходняга Туркестана, якая кантактуе з афганскімі талібамі, стаяла за тэрактамі, напрыклад, за забойствам кітайскага дыпламата ў Кіргізіі і атакай на паліцэйскі ўчастак напярэдадні пекінскай алімпіяды. У свой час адміністрацыя Белага дома нават хваліла кітайскія ўлады за бязлітасную вайну з уйгурскімі тэрарыстамі. Пекіну, відавочна, выгодна падтрымліваць на Захадзе такі імідж уйгурскага руху.

Аднак ужо той факт, што кітайскі лідэр Ху Цзіньтао адмовіўся з-за пратэстаў ва Урумчы ад удзелу ў саміце Вялікай васьмёрцы, кажа пра складанасць становішча. Відавочна, што механізмаў развязання праблемы ў Пекіна пакуль няма. Больш таго, цяпер яму трэба вырашаць не толькі уйгурскае, аднак і кітайскае пытанне.

Простыя ханьцы рэагавалі на навіны з Урумчы гэтак жа, як расіяне рэагавалі на паведамленне пра тое, што ў Таліне перанеслі помнік савецкім салдатам. Кітайскія інтэрнэт-форумы захліснула хваля шавінізму. Прэса піша нават пра пагрозу уйгурскіх пагромаў. Тым больш, што уйгуры ў кітайскіх рэгіёнах маюць імідж, падобны да іміджу каўказцаў у Расіі. Звычайна яны займаюцца дробным гандлем, аднак у грамадстве пашырана шмат ксенафобскіх стэрэатыпаў, адпаведна якім кожны уйгур — заўзяты злачынца.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# ЧАТЫРНАЦЦАЦЬ ЗАБІТЫХ БІСКУПАЎ

Алег ПЯТРОЎ

**Каталіцкая грамада краіны баскаў патрабуе бенефікацыі забітых франкістамі біскупаў. Кіраўніцтва іспанскага каталіцкага епіскапату рэзка супраць.**



Варта прыгадаць, што да гэтага часу царква прызнавала пакутнікамі выключна тых дзеячаў, якія падчас грамадзянскай вайны ў Іспаніі загінулі ад рук рэспубліканцаў.

У шэрагах апошніх было шмат анархістаў, якія заўсёды бачылі ў Касцёле сімвал прыгнёту і цемрашальства. Вайна развязала ваяўнічым атэістам рукі. Паколькі аматары ідэяў Бакуніна былі важнай фракцыяй лагеру прыхільнікаў рэспублікі, лідэры апошняй (пераважна памяркоўныя сацыялісты) былі вымушаны заплюшчваць вочы на пагромы манастыроў і храмаў, масавыя забойствы царкоўных служак, здзекі з святыняў і г.д.

З іншага боку, у анархістаў было саліднае апраўданне, каб чыніць гвалт з царквы: кіраўніцтва іспанскага Касцёла афіцыйна падтрымала Франка. У сваю чаргу, Франка ў закліку да паўстання сцвярджаў, што пачынае змагацца з рэспублікай «у імя каталіцызму і правоў Касцёла».

Пасля перамогі фашыстаў у 1939 годзе тэма забітых рэспубліканцамі каталікоў стала адным з асноўных дзяржаўных міфаў іспанскай дыктатуры. З часам у кіраўніцтве іспанскай каталіцкай царквы ўзнікла ідэя дабівацца іх бенефікацыі. Рым ахвотна падтрымаў ініцыятыву Мадрыда. У 1987 годзе Папа Ян Павел II правёў працэдуру бенефікацыі 474 іспанскіх каталіцкіх святароў — ахвяр рэспублікі. У кастрычніку 2007 года Бенедыкт XVI прызнаў пакутнікамі яшчэ 498 царкоўнікаў, якія загінулі ад рук усё тых жа рэспубліканцаў.

Аднак сёння высвятляецца, што падчас грамадзянскай вайны былі зафіксаваныя факты, калі каталіцкіх святароў забівалі і фашысты. Маюцца на ўвазе 14 баскскіх біскупаў, якіх без суду і следства франкісты паставілі да сценкі ў ліпні 1936 года. Увогуле, на тэрыторыі Краіны Баскаў было забіта 80 духоўных асобаў.

Віна апошніх была ў тым, што яны падтрымлівалі рэспубліканцаў. Рабілі яны гэта таму, што рэспубліканцы далі дзяржаўную аўтаномію баскам. Акрамя таго, кіраўнікамі аўтаноміі былі сябры Баскскай нацыяналістычнай партыі (*PNV*), складнікам ідэйнай дактрыны якой ёсць інтэгральны каталіцызм. Заснавальнікі *PNV* нават сцвярджалі, што баскі, якія ў X стагоддзі прыпынілі рух арабаў на Еўропу, — абраны Богам народ.

Прайшло 73 гады, і цяпер каталікі Краіны Баскаў, якія маюць з 1979 года аўтаномію, нечакана вырашылі ўшанаваць памяць тых 14-ці царкоўнікаў. З гэтай нагоды 11 ліпеня ў Віторыі (сталіца Баскскай аўтаноміі) адбыліся спецыяльныя мерапрыемствы. У прысутнасці 200 чалавек біскуп правёў спецыяльнае набажэнства ў гонар нябожчыкаў. Было агучана патрабаванне — прызнаць іх пакутнікамі. Акрамя таго, каталікі-баскі настойвалі, каб каталіцкі клір Мадрыда прынёс прабачэнні. Варта згадаць, што ў 1936 годзе забітых баскскіх біскупаў іспанскі Касцёл забараніў хаваць па хрысціянскаму звычаю. Іх целы папросту кінулі ў агонь.

Здавалася б, у кантэксце палітычнага прымірэння шанаванне 14-ці забітых — справа добрая. Між тым, тэма баскскіх біскупаў — не проста пытанне ўсталявання гістарычнай справядлівасці.

Правая прэса Іспаніі адразу заўважыла адну супярэчнасць: ужо 30 гадоў краіна жыве па законах дэмакратыі, і толькі зараз баскі ўзгадалі пра тых 14 ахвяр франкістаў. Што замінала ім казаць пра гэту трагедыю раней? На думку журналістаў правых выданняў, тут прысутнічае палітычная кан'юнктура. Акцыя ўшанавання ў Віторыі прайшла на фоне канфлікту Касцёла з урадам сацыялістаў. Сацыялісты апошнім часам правялі некалькі рэформаў, якія выклікалі рэзкую крытыку з боку Касцёла. Гутарка пра законы, які пашыраюць правы гомасексуалістаў і лесбіянак, дазваляюць аборты, забараняюць дэманстрацыю рэлігійных сімвалаў у навучальных установах.

Незвычайная акцыя баскскіх каталікоў была яўна накіраваная супраць цяперашняга вельмі кансерватыўнага епіскапату іспанскай каталіцкай царквы, якой кіруе Антоніа Марыя Рока. Не дзіўна, што ніводны прадстаўнік Іспаніі імшу ў Віторыі не наведаў. У 2011 годзе мансеньёру Рока будзе 75 гадоў, і, адпаведна статуту, ён мусіць скласці паўнамоцтвы. У Касцёле пачынаецца ціхая вайна за тое, хто будзе новым старшынёй епіскапату. Шмат хто звярнуў увагу на тое, што за арганізацыяй цырымоніі ў Віторыі стаяў епіскап Більбао мансеньёр Рыкарда Бласкес, якога лічаць кандыдатам на пасаду кіраўніка епіскапату ад фракцыі рэфармістаў.

Цікава, што ў гэтай канфрантацыі сімпатыі Папы Рымскага Бенедыкта XVI, які лічыцца заўзятым фундаменталістам, прынамсі як піша прэса, на баку групы Бласкеса. Некаторыя каментатары нават кажуць, што падзеі ў Віторыі санкцыянаваў асабіста Бенедыкт.

Самі сацыялісты сцвярджаюць, што ніякай палітыкай тут і не патыхае. Зараз у краіне ідзе кампанія за рэабілітацыю ўсіх ахвяр фашысцкага тэрору. І шанаванне забітых каталіцкіх дзеячаў цалкам ёй адпавядае. На пытанне пра тое, чаму 30 гадоў ніводны баскскі біскуп не згадаў пра забітых у 1936-м, таксама ёсць адказ. Усе 30 гадоў у рэгіёне актыўна дзейнічала тэрарыстычная групоўка ЕТА, якая выступае за стварэнне незалежнай баскскай дзяржавы. Тэма забітых біскупаў адразу была б выкарыстана тэрарыстамі ў палітычным мэтах. З іншага боку, гэта адначасова магло б мабілізаваць прыхільнікаў Франка, а дэмакратычныя інстытуты ў Іспаніі доўгі час былі вельмі слабымі. Сёння і тэрарыстаў прыціснулі, і франкісты ператварыліся ў маргіналаў.




## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ



### ІАЛАНТА КВАСЬНЕЎСКАЯ

Жонка былога прэзідэнта Польшчы Аляксандра Квасьнеўскага паставіла на вушы ўсю польскую палітыку. Прайшлі чуткі, што яна збіраецца ісці ў прэзідэнты (выбары кіраўніка польскай дзяржавы адбудуцца ў наступным годзе). Гэта стала сапраўдным выбухам. Па апытаннях сацыялагічных службаў, у такім выпадку жонка Квасьнеўскага магла б скласці значную канкурэнцыю цяперашняму прэм'еру Дональду Туску з ліберальнай Грамадзянскай платформы і паспрачацца з ім за права прадстаўляць у другім туры антыкансерватыўны лагер. Аднак у выніку лібералы маглі ўздыхнуць свабодна. У інтэрв'ю аднаму з польскіх каналаў пані Квасьнеўская паведаміла, што выстаўляць сваю кандыдатуру не будзе, паколькі «павінна рабіць для мужа халаднік і маласольныя агуркі». Аднак праўда аказалася больш цікавай. Аляксандр Квасьнеўскі марыць не толькі пра халаднік і агуркі. Ён вырашыў падацца ў старшыні ААН. Такі шанец ён атрымае ў 2011 годзе, калі скончыцца кадэнцыя цяперашняга старшыні. Калі другая палова стане прэзідэнтам у 2010 годзе, то пра сваю мару сесці ў крэсла кіраўніка ААН, Квасьнеўскі можа забыцца. Як піша прэса, Іаланта вырашыла не замінаць мужу. Як мінімум да наступных прэзідэнцкіх выбараў.



### МІКАЛАЙ ЛЕВІЧАЎ

Сябра думскай фракцыі «Справядлівая Расія» прапанаваў лічыць 31 снежня афіцыйным выхадным. «Усё адно большасць расіянаў калі і з'яўляецца на працоўным месцы ў апошні дзень года, то толькі каб выпіць у працоўным калектыве», — аргументуе Левічаў. Дэпутат таксама кажа, што доўгія навагоднія вакацыі трэба трохі скараціць, а майскія святы — павялічыць. Нашто? Паколькі «грамадзяне традыцыйна праводзяць свой непрацоўны час на дачных участках». Самае смешнае, што падобны законапраект раней зарэгістраваў кіраўнік «Справядлівай Расіі» Сяргей Міронаў. Між тым, стала вядома, што Крэмль вырашыў актывізаваць праект эсэраў, які быў прыдуманы, каб адцягваць галасы левага электарату. Магчыма, увесь сыр-бор з-за гэтага. Дарэчы, ініцыятыва Левічава ўздымае яшчэ адно пытанне: калі людзі пачнуць сыходзіць на навагоднія святы 30 снежня, хіба яны ў гэты дзень будуць працаваць?

### КЛАУС ВАВЕРАЙТ



Сацыял-дэмакратычны мэр Берліна праславіўся не толькі тым, што даўно і даволі нядрэнна кіруе сталіцай ФРГ. Ён аўтар фразы: «Я гей, і гэта добра». Шмат хто лічыў, што прызнанне ў нетрадыцыйнай сексуальнай арыентацыі паставіла крыж на глабальных планах Клауса. Аднак на фоне поўнага крызісу нямецкіх эсдэкаў, якія не могуць знайсці харызматычнага лідэра, на фігуру мэра-гея нечакана паглядзелі па-іншаму. Адпаведна апытанням сяброў партыі, аказалася, што цяперашнія лідэры на фоне мэра Берліна папросту шэрыя і нецікавыя функцыянеры. У той час, як адно словазлучэнне «мэр-гей» выклікае бурную цікавасць публікі. Не кажучы пра тое, што Ваверайт можа пахваліцца досведам кіравання цэлым мегаполісам. Адным словам, эсдэкі з жахам чакаюць верасьнёўскіх выбараў у Бундэстаг. Правал іх лідэра Штайнмайера (а да гэтага ўсё ідзе) адчыніць аўтарытэтнаму Ваверайту шлях да пасады кіраўніка партыі. Можа, гэта і добра, аднак ці будуць бюргеры галасаваць за партыю гея — гэта вялікае пытанне.

▸ НОВАЯ ГЕНЕРАЦЫЯ

# СУСЕД БОГА

Марыя МАРТЫСЕВІЧ

**Аднойчы мой таварыш вырашыў зладзіць перформанс. Акцыя прадугледжвала некаторыя публічныя дзеянні. Перад тым, як несці элітарнае мастацтва ў масы, ён патэлефанаваў знаёмай праўніцы, маўляў, што мне будзе, калі я выйду на цэнтральную вуліцу і здзейсню такія і такія рэчы. Знаёмая выслухала і адказала: «У нашай краіне, даражэнькі, твой лёс у гэткай сітуацыі — пытанне не юрыспрудэнцыі, а тэалогіі». Можа, менавіта праз гэтую містычную акалічнасць усяго, што адбываецца ў Беларусі і з беларусамі, адну з найлепшых кніг пра беларускую ідэнтычнасць напісаў святар*.**



Аўтара эсэістычнага трактату «Паўстанне Беларусі», філосафа і публіцыста каталіцкага дыякана Пётру Рудкоўскага з ордэна дамініканцаў я сустракала ў розных кутках Цэнтральнай Еўропы і пры розных абставінах. У місіях дамініканскага ордэну ў Кракаве і Віцебску, дзе ён ладзіў беларускія бяседы, у Вільні — выпадкова на вуліцы, у Мінску на рок-канцэрце ў клубе, дзе ён гасцінна запрашаў за свой столік таварышаў і надзяляў іх поснай піццай, у Варшаве ў Інстытуце Лазарскага, дзе ён працаваў да апошняга часу. Але падчас усіх гэтых сустрэч у былых і прысных сталіцах, якія адбыліся пасля нашага з ім знаёмства, мне так і не ўдалося *пазнаёміцца* з Пётрам. Гэты сціплы і ціхі чалавек здаваўся мне незвычайнай кветкай, дагэтуль невядомай батанікам. Вельмі карцела ўзяць рыдлёўку і зірнуць на карані незразумелай расліны. Я выпытала ў Рудкоўскага, як называецца месца, дзе ён нарадзіўся, і аднойчы выправілася туды — знаёміцца.

## Да папа Івана

У сярэднявеччы людзі верылі, што за гарамі-лясамі, недзе на Усходзе існуюць уладанні прэсвітэра Джона (ён жа поп Іван). Дайсці да гэтага міфічнага царства было справай амаль нерэальнай і вельмі небяспечнай, але тыя, каму ўдавалася, траплялі ў прыўкрасны ідылічны свет міра, дабра і справядлівасці. Я не чакала ад малой радзімы Рудкоўскага райскіх кушчаў, але ўжо па дарозе мне стала зразумела, чаму мой таварыш падпісваецца ў інтэрнэце псеўданімам Джон Купала. Заход сонца, захад Беларусі. Пётра стаіць каля памежнага пункту «Беняконі–2» і іранічна глядзіць на мяне, ушчэнт здарожаную і пераляканую. Я трымаю ў руках пашпарт і «корачку» журналіста, якія мне толькі што вярнулі. «Менавіта таму я кажу ўсім, што паходжу з Віленшчыны, — вітае мяне Пётра. — Праз Вільню было б бліжэй і не так страшна».

Каб дабрацца да вёскі Канвелішкі Воранаўскага раёну Гродзенскай вобласці, я, згодна з шляхам, падказаным мне адміністрацыйным дзяленнем РБ, спачатку прыехала ў Гродна. Выявілася, што да пункта прызначэння яшчэ 150 км, то бок 4 гадзіны павольным прыгарадным аўтобусам. Мяне ратуе папутка. «Значыць, да ксяндза едзеш? У Канвелішкі? Едзь-едзь. А дазвол у цябе ёсць?» — сэнс пытання кіроўцы даходзіць да мяне, толькі калі той падвозіць мяне да пастаральнай аднакалейкі, што бяжыць між лясоў, і перасаджвае ў дызель «Ліда—Беняконі». З якога мяне роўна праз пяць хвілінаў здымае памежны патруль, бо «дазволу» ў мяне няма. У мяне забіраюць дакументы, назву газеты «Новы час» перадаюць па рацыі начальству аж у Гродна. Нарэшце мой лёс вырашаны. «Дзе яе ксёндз?» — «Вунь той, у шортах», — «Вы яе ксёндз?» — «Ну, я», — «Дакументы… Ведаеце, дзе ў Канвелішках пагранзастава?» — «Ведаю», — «Дык вось, каб бліжэй, як на 500 метраў, гэтая да яе не падыходзіла. Ну і дзень. Трэцюю дуру сёння з дызеля здымаем!»

Ранкам наступнага дня, выходзячы з дому ў сад, я аўтаматычна парушаю абяцанне наконт 500 метраў. Бо Канвелішкі — пуп беларускай зямлі, з усіх бакоў абкружаны Літвой.

## У Канвелішках Бог жыве

Пётра рос побач з Богам. Не ў сэнсе надзвычайнай пабожнасці яго сям'і і яго асабістай, а ў самым простым: з Богам у яго бацькоў мяжуюць падворкі. Богам у Канвелішках празвалі мясцовага дзівака, які любіць прыгаворваць: «Я Бог, я ўсё ведаю». Жонку гэтага чалавека, адпаведна, завуць Багіняй, а дзяцей — Бажанятамі. Дом у Бога аранжавы, як і большасць дамоў у мястэчку, — у гэты колер мясцовыя фарбуюць нават машыны і ровары. Некаторыя гаспадары ў супрацьвагу гэтай «памаранчавай рэвалюцыі» выбіраюць для хат іншыя яскравыя колеры — модныя ў гэтым сезоне пастэльныя тоны суседзяць з насычаным бардо і сакавітай бірузою. Шэрымі і бясколернымі стаяць адно забудовы грамадскія: крама, дом культуры, школа ды цагляныя катэджы ў цэнтры (якія тут, што, дарэчы, традыцыйна для Заходняй Беларусі, называюць Шанхай: у такіх дамах людзі жывуць адно ў аднаго на галовах, нібы кітайцы).

Сенсацыйныя карані, дзеля якіх я сюды дабіралася, адкрываюцца надта хутка. Я высвятляю, што святаром Пётру Рудкоўскага зрабілі сям'я, школа, вуліца. Пасля вайны адна з сясцёр яго маці Марыі пайшла ў падпольны жаночы кляштар, што стала прадметам зайздрасці ўсёй сям'і. Марыя таксама марыла стаць манахіняй, але сёстры не дазволілі — маўляў, калі ўсе да Хрыстуса, хто на гаспадарцы застанецца? Дзяўчына выйшла замуж і нарадзіла пяцёра дзяцей. І калі ў 1978 годзе ў Яна і Марыі Рудкоўскіх з'явіўся хлопчык (у Беларусі кажуць — «пазняк»), неяк само сабой меркавалася: ксёндз падрастае.

## Прагрэс душы

Пётра меў дзяцінства Далай Ламы. У хаце Рудкоўскіх, заміж абразоў і сямейных партрэтаў, вісіць здымак айца Апалінарыя Зубялевіча — адзін з нямногіх нашых святароў, які здолеў захаваць парафію нават за Саветамі. З маленства дапамагаючы пробашчу падчас імшы, мой герой адчуваў адмысловае стаўленне да сябе ўсіх навокал. Само сабою, пераходны ўзрост унёс у жыццёвыя планы свае карэктывы: падлеткам Рудкоўскі і чуць нічога не хацеў пра будучае святарства. Але і гэты перыяд прамінуў. «Магчыма, тое, што ўсе змалку ставіліся да мяне як да святара, — гэта быў спосаб, якім Бог паказваў мне мой шлях», — закрывае ён тэму жыццёвага выбару.

Але ў любым выпадку, Рудкоўскі бачыў сваю будучыню інакш за родных і блізкіх. Скончыць семінарыю і стаць пробашчам у якім-небудзь заходнебеларускім касцёле, няхай і пазітыўна-аранжавым, здавалася яму надта простым шляхам. Слова «ксёндз» — такое сакральнае для любога верніка — патрабавала для яго нейкага пашырэння, накшталт кампутарнага **.txt ці *.doc*. Простага **.exe* было недастаткова.

Храналагічна першым пашырэннем, якое Пётра спрабаваў прыстасаваць да свайго ўнутранага «ксяндза», было «паэт». Вершы па-польску ён пісаў усё юнацтва, але цяпер «нават самому сабе» тых тэкстаў не паказвае. Даволі хутка будучы «ксёндз» і нявздзейснены «паэт» пераключыўся на прозу. У школе, натхнёны знойдзеным на сметніку старым польскім гістарычным раманам, Рудкоўскі напісаў польскамоўны твор на 800 старонак школьнага сшытка. Ён называўся «Прагрэс душы» і адсылаў сваіх нешматлікіх чытачоў у часы першых хрысціянаў. Але мову, як і тэматыку творчасці, неўзабаве захацелася змяніць. Пётра пачаў пісаць забаўляльныя аповесці для школьных сяброў, спачатку па-руску, а потым на беларускай мове.

Тое, што і гэтае захапленне хутка прамінула, «ксёндз-празаік» сціпла і звышсамакрытычна лічыць шчасцем для літаратуры — як польскай, так і беларускай. Юны Рудкоўскі сеў, падумаў і вырашыў, што паэтаў і празаікаў у свеце стае, а вось беларусацэнтрычнага (духоўнага і не вельмі) мыслення бракуе. Так намалявалася яго творчая будучыня, шлях, па якім варта было ісці: ксёндз-тэарэтык, ксёндз-філосаф. Пасля Гродзенскай семінарыі — Папская тэалагічная акадэмія і філасофскі факультэт Ягелонскага універсітэта ў Кракаве.

## Беларусы Шанхаю

5 ліпеня — дзень, у які я трапіла ў Канвелішкі, мястэчка нагадвала соннае царства. Папярэдняй ноччу ўся ваколіца была на фэсце ў Тракелях, на Каранацыі Маці Божай. Усе Канвелішкі пагалоўна абгарэлі на сонцы падчас пілігрымкі, стаміліся і не выспаліся. Гэты стан спарадзіў нейкую фізічна-духоўную еднасць паміж Пётрам і ўсімі навокал яго — значна больш трывалую, чым, скажам, штамп аб прапісцы. Я згадала хлопцаў-пагранцоў, якія мяне толькі што затрымалі. Большасць з іх таксама была сонная і абгарэлая. Да мяне дайшло: я не ў памежную зону трапіла, я толькі што перасекла самую натуральную мяжу. Значна больш сур'ёзную за тую, якую тут так дбайна ахоўваюць. Фармальна я знаходзілася ў Беларусі — але ментальна я была на абсалютна іншай тэрыторыі. Пётра нарадзіўся ў Беларусі, якая Беларуссю ніколі не была. У большасці беларускіх літаратараў, у чым яны з гонарам прызнаюцца следам за Альберам Камю, ёсць адна радзіма — мова. Само сабой, беларуская. У тутэйшых таксама ёсць прыгожая і велічная радзіма — Касцёл. Само сабой, польскі. І ў гэтым сэнсе Пётра — тыповы жыхар памежнай зоны. У яго дзве радзімы.

У юнацтве Пётра меў свядомасць «паляка-беларусафіла». Самастойна ў дзяцінстве вывучыў польскую мову, што, нягледзячы на дэкларатыўную польскасць, вельмі рэдка сустракаецца ў каталіцкіх рэгіёнах Беларусі. У Гродзенскай каталіцкай семінарыі яго, і без таго большага паляка, чым самі палякі, прыняліся апалячваць з новай інтэнсіўнасцю. Менавіта тады ён канчаткова адчуў сябе беларусам (у знак чаго знайшоў у семінарскай бібліятэцы падручнік літоўскай мовы і навучыўся яшчэ адной мове свайго рэгіёну). Каб пабачыць, дзякуючы каму Пётра адчуў сябе беларусам першапачаткова, мы ідзем у Шанхай. Тут маюць кватэры супрацоўнікі канвелішскай сярэдняй школы. Фізрук, які поле грады, пазнае Пётру па кроках. Настаўнік англійскай і беларускай мовы Генадзь Феліксавіч Даржынкевіч вярнуўся з поля і частуе нас клубніцамі.

Людзей, якія нават у самых складаных палітычных і этнічных умовах адданыя беларускай культуры, у краіне вельмі няшмат. Але яны ёсць паўсюль — зніТоўваюць краіну сеткай накшталт інтэрнэту. Менавіта праз яго Пётра калісьці падключыўся да беларушчыны. А пасля ўжо было рукой падаць да таго, чым ёсць Пётра цяпер — беларуса-еўрапейца. Даволі экзатычнае, дарэчы, спалучэнне.

## Вяселле ў Германішках

«Вось вы едзеце да свайго ксяндза. Едзьце-едзьце. А як прыедзеце, запытайцеся, калі вяселле ў германішскага пробашча!» — кіроўца маёй папуткі ўводзіць мяне ў курс самага гучнага рэгіянальнага скандалу апошняга часу: ксёндз у Германішках адмовіўся ад сану і стварае сям'ю.

Ёсць тэмы, на якія з людзьмі духоўнымі гаварыць найцяжэй. Нам дапамагае школьны дзённік вучня 10-га класа Пятра Рудкоўскага. Прынесены, каб прадэманстраваць яўныя гуманітарныя схільнасці яго ўладальніка (трывалыя траякі па фізіцы і хіміі, круглыя пяцёркі па мовах, літаратуры, гісторыі), ён выпадкова здраджвае і прыадчыняе яшчэ адну таямніцу. Яшчэ падчас папярэдніх сустрэчаў з Пётрам і ў Канвелішках, разглядаючы фотаздымкі, я заўважыла, што ў яго ёсць адно хобі: сябраваць з дзяўчатамі. Нават ратаваць мяне ад беняконьскіх памежнікаў Пётра прыехаў не адзін, а з сяброўкай. Як выявілася падчас чытання дзённіка, ягоным хобі ў старэйшых класах было сябраваць з дзяўчатамі па перапісцы. З дзённіка выпадае адзін такі «сяброўскі» ліст, чамусьці не адпраўлены. Напісаны шаснаццацігадовым Пётрам па ўсіх правілах куртуазнай галантнасці, ён красамоўна сведчыць пра характар будучага дамініканца. Пасля семінарыі Пётра на некалькі год адтэрмінаваў рукапалажэнне ў сан у роздумах, ці ён гатовы да гэтага, але ўрэшце дыяканам зрабіўся.

«Як паказваюць сацапытанні, 50 працэнтаў каталіцкіх ксяндзоў і манахаў хацелі б ажаніцца і мець дзяцей», — пішуць у інтэрнэт-навінах. «Лухта! — каментуюць такія навіны самі каталіцкія ксяндзы і манахі, — кожны з нас хацеў бы мець сям'ю». Служэнне Богу і людзям — тое, для чаго святар мусіць ахвяраваць найважнейшым у жыцці кожнага чалавека. У якую б краіну ці горад не накіраваў Пётру яго Ордэн, ён знаходзіць магчымасць часта бываць на радзіме. Падчас прыездаў дадому Пётра ў белых дамініканскіх шатах дапамагае на імшы ў касцёле. Касцёл поўніцца паненкамі. Гэта выглядае вельмі рамантычна.

## Закапаць карані

Я выходжу ў сад, набліжаючыся такім чынам да Канвелішскай пагранзаставы на 498 метраў. Я не адзіная нелегалка пад яблынямі: падкапаўшы плот, тут зацята грабуцца, асцярожна азіраючыся на гаспадароў, рудыя куры. Жыхары Канвелішак падзяляюцца на дзве няроўныя групы: тыя, што маюць літоўскія або шэнгенскія візы, і тыя, што іх не маюць. Тыя, што маюць, ходзяць у літоўскія крамы па хлеб, закупляючы яго на ўсю радню. Кожны з іх павінен насіць у пашпарце безліч паперак і дэманстраваць штамп аб прапісцы на безлічы КПП, якія ўпрыгожваюць мясцовыя краявіды. Беларуская Віленшчына надзіва малалюдная: вёскі, мястэчкі знаходзяцца далёка адно ад аднаго, і мясцовыя жыхары гойсаюць паміж імі на джыпах і скутэрах па прыгожых пустых дарогах.

Насуперак усім тэзам сталічных інтэлектуалаў, я не пачуваюся тут «паміж». Я пачуваюся тут «нідзе». І разумею адну дзіўную рэч. Нягледзячы на аддаленасць ад адміністрацыйных цэнтраў і спецыфічны статус, тутэйшыя жыхары — самыя свабодныя людзі, якіх я сустракала ў жыцці. Нягледзячы на максімальную пабожнасць і традыцыйнасць выхавання — гэта самыя ліберальныя паводле поглядаў грамадзяне маёй краіны, якіх я сустракала. Нягледзячы на блізкую Вільню і вечную Польшчу — гэта квінтэсенцыя таго, якой асабіста я бачу сваю Беларусь. Я бяру рыдлёўку і асцярожна закопваю карані. Знаёмства адбылося. Эксперыментальным шляхам я выявіла адну важную рэч: кнігу «Паўстанне Беларусі» дыякан Пётра Рудкоўскі напісаў пра сябе і свае Канвелішкі.

*** Слова «святар» у гэтым артыкуле ўжываецца ў больш шырокім значэнні, як сінонім слова «духаўнік»**

ТАЯМНІЦЫ ГІСТОРЫІ

# ВЯРТАННЕ СТРАЧАНАЙ СПАДЧЫНЫ

Аляксей ХАДЫКА

**Напрыканцы чэрвеня прайшлі 178-я ўгодкі буйнейшай бітвы нацыянальна-вызваленчага паўстання 1830–1831 гадоў у Беларусі і Літве, падчас якога патрыятычна настроеныя прадстаўнікі шляхты змагаліся са зброяй у руках за аднаўленне незалежнай ад Расійскай імперыі дзяржаўнасці свайго былога гаспадарства — Вялікага Княства Літоўскага.**


Людвік Міхал Пац (1780–1835), гравюра XIX ст.


Партрэт Марыі Патоцкай пэндзля Л. Горавіца


Партрэт Казіміра Міхала Паца.

## Страчаныя каштоўнасці

На Панарскіх узгорках атрады буйнейшага корпуса беларуска-літоўскіх паўстанцаў галоўнакамандуючага генерала А. Гелгуда, які налічваў да 12 тысяч ваяроў, сышліся ў бойцы з 26-тысячным расійскім войскам. Сышліся, каб нанесці ворагу страты ў 364 жаўнеры (палеглыя з боку паўстанцаў не былі падлічаныя), і ўсё ж такі саступіць, а затым пакінуць апанаваную ворагам радзіму праз прускую мяжу. Частка змагароў на чале з генералам Г. Дэмбінскім праз Смаргонь, Дзярэчын і Белавежскую пушчу адыходзіла ў Польшчу, дзе полымя паўстання, прыдушанае ў Беларусі напрыканцы лета, палала яшчэ ўвосень.

Я прыгадаў звязаную з паўстаннем дату не столькі для таго, каб чарговы раз ушанаваць гонар яго герояў. Наступствамі паўстання сталіся не толькі чалавечыя ахвяры і эміграцыя патрыётаў, але і велізныя страты культурных каштоўнасцяў, што вывозіліся з канфіскаваных маёнткаў. У спісах карцін, якія папоўнілі калекцыі пецярбургскіх Эрмітажа і Акадэміі мастацтваў, налічвалася 287 карцін выдатных еўрапейскіх майстроў XVI–XVIII стагоддзяў (Франка Франчыя, Паола Веранэзэ, Саламона і Якуба Рэйсдэляў і іншых), а таксама сямейных партрэтаў. А яшчэ рукапісы, стадрукі, рэчы з золата і срэбра — спіс ювелірных і дэкаратыўных рэчаў на 18 старонках.

Калі пра сапегаўскую калекцыю ў Беларусі апошнім часам трошкі пісалі, то пра рассеяныя зборы Пацаў, некалькі экспанатаў з каторых днямі прыехалі на выставу ў Мінск са Смаленска, вядома значна меней. Яны перажылі свой драматычна-дэтэктыўны лёс.

## Людвік Міхал Пац

Паўстанне ў Польшчы выбухнула раней, чым у Беларусі, — у ноч на 29 лістапада 1830 года ў Варшаве, і таму называецца лістападаўскім. Сярод беларуска-літоўскіх удзельнікаў падзей у Польшчы вылучаўся Людвік Міхал Пац (1780–1835). Ён ваяваў супраць Расіі яшчэ ў 1812–1813 гадах камандзірам эскадрона лёгкай конніцы напалеонаўскай арміі, з прыходам якой патрыёты звязвалі дарэмныя надзеі на аднаўленне Рэчы Паспалітай з Канстытуцыяй 1791 года.

І ў 1830–1831 гадах Пац не змог не апынуцца ў шэрагах завадатараў барацьбы, зрабіўшыся часовым галоўнакамандуючым, сенатарам-ваяводам і сябрам Адміністрацыйнай рады ў Варшаве. Пасля паразы паўстання яго чакала эміграцыя, а на радзіме засталася ладная спадчына — палацы ў Вільні і Гародні, маёнткі ў Ражанцы і Гарадзішчы, а таксама ў Даўспудах, Рачках і Мазурках у колішніх заходніх землях ВКЛ, цяперашняй Беласточчыне.


Палац у Высокім Літоўскім, гравюра паводле малюнка Напалеона Орды 1876 г.

Менавіта ў Даўспудах знаходзіўся значны мастацкі збор. У яго ўваходзілі творы антычнай і класіцыстычнай скульптуры, галандскага, фламандскага і італьянскага жывапісу, значная галерэя продкаў, калекцыя старасвецкай зброі і дакументаў. Пад пагрозай канфіскацыі пасля паўстання гаспадар схаваў шэдэўры па кляштарах, касцёлах і знаёмых — у ксяндзоў у Рачкаве і Янаўцы, у прафесара Варшаўскага універсітэта А. Бланка. А частку вывез у Парыж. Аднак уладам удалося адшукаць значную іх колькасць — толькі з Рачкаў 169 твораў былі выстаўлены на аўкцыён (у 1835 годзе) або пушчаны на патрэбы новых гаспадароў.


Палац у Даўспудах. Гравюра XIX ст.

## Калекцыя дзвюх сем'яў

У хуткім часе з Францыі вярнулася дачка і адзіная спадчынніца мяцежнага генерала Людвіка Паца. Выйшаўшы замуж за ўладальніка палаца ў Высокім Літоўскім каля Камянца на Берасцейшчыне Ксаверыя Сапегу (зводнага брата ўладальніка Дзярэчына Яўстахія), пасля 1840 года яна пасялілася ў гэтым маёнтку. Менавіта тут аб'ядналіся парэшткі слаўных калекцый дзвюх сем'яў. Людвіка прывезла сюды ў 1845 годзе зборы з Францыі, а праз два гады — 40 карцін і скульптур, выпадкова не канфіскаваных у Рачках.

На жаль, і надалей мастацкія скарбы чакаў няпросты лёс: новыя гаспадары пасля чарговага паўстання 1863 года зноў выязджаюць у Францыю, селячыся ў сямейным палацы ў Беарыц. З імі едуць і мастацкія творы. Сын Ксаверыя і Людвікі, Людвік Сапега, у 1904 годзе прадае 115 карцін заходнееўрапейскіх майстроў са шматпакутнай сямейнай спадчыны на аўкцыёне ў Парыжы.

Не ўсе скарбы, аднак, пакінулі Высокае Літоўскае ў заходнім накірунку, застаўшыся ў дачкі Ксаверыя і Людвікі, Марыі Сапежанкі, у замужжы — Патоцкай. Больш за тое, яе сын Якуб Патоцкі пазней выкупіў некаторыя сямейныя рэліквіі на тым самым аўкцыёне 1904 года.

Пасля смерці графа Якуба (1934 год) па тэстаменце творы адышлі Нацыянальнаму мастацкаму музею ў Варшаве — з пазнакамі мытняў 1845 года (першае вяртанне з Францыі), аўкцыёну ў Парыжы і …інвентарызацыі, праведзенай у Высокім. Менавіта такія азначэнні, белай фарбай на вонкавым баку твораў, але без адзнак, што сведчаць пра перамяшчэнні за мяжу, носяць сямейныя партрэты Пацаў і Сапегаў з так званай «польскай калекцыі» ў Смаленскім дзяржаўным музеі-запаведніку. Шлях гэтага збору, які налічвае каля 50 твораў, з земляў ВКЛ у Смаленск, куды яны патрапілі ў часы першай сусветнай вайны, заблытаны: бракуе дакументаў.

## Перліны Пацаў і Сапег

Днямі ў Мінску адбыўся сапраўдны цуд. Некаторыя мастацкія перліны, аскепкі спадчыны Пацаў і Сапег, шчасліва ацалеўшы ў часы другой сусветнай вайны і адрэстаўраваныя ў апошні час, прыехалі ў Мінск у складзе выставы «Выратаваныя культурныя каштоўнасці». Яна адчынілася 30 чэрвеня ў Нацыянальным музеі гісторыі і культуры і будзе дзейнічаць па верасень месяц.

Асабліва выдатным творам у экспазіцыі з'яўляецца партрэт мальтыйскага кавалера Казіміра Міхала Паца (памёр у 1719 годзе), вялікага літоўскага пісара і камандора ў Рэчы Паспалітай «на Сталовічах і Познані» найстарэйшага рыцарска-манаскага Мальтыйскага ордэна. Велічны касцёл, узведзены беларускім мальтыйцам, папярэднікам Паца Жыгімонтам Каралем Радзівілам, дагэтуль узвышаецца ў Сталовічах ля Баранавіч і дзейнічае зараз як праваслаўны храм. Сам жывапісны партрэт, пагруднае адлюстраванне рыцара ў даспехах з мальтыйскім крыжам, адзначаны выдатнымі мастацкімі якасцямі, прыпісваецца калі не пэндзлю славутага мастака французскага двара Людовіка XIV, дык майстрам яго кола.

Побач з ім на выставе — выява вялікага літоўскага гетмана Казіміра Яна Сапегі (1642–1720). Сапега — удзельнік трыумфальнай кампаніі супраць туркаў у Еўропе караля Яна III Сабескага ў 1683 годзе і пераможца тых жа непрыяцеляў у шэрагу лакальных войнаў. Пасля адной з бітваў у кастрычніку 1694-га і вяртання «літоўскага» войска з-за Днястра, у Вільні Сапегу чакалі трыумфальныя брамы і ўрачысты прыём. Магчыма, тады паўстаў першаўзор параднага партрэта, на якім фігура Славы з трубой каранує коннага гетмана лаўровым вянком на фоне вайсковай баталіі. Гэтая рэпліка аналагічнай выявы гетмана з калекцыі Дзяржаўнага гістарычнага музея ў Маскве, як і папярэдні партрэт, патрапіла ў Беларусь упершыню за доўгія дзесяцігоддзі.

Наведаўшы зараз музей на Маркса, 12, можна ўбачаць і рамантычны вобраз спадчынніцы Сапегаў і Пацаў Марыі Патоцкай пэндзля Леапольда Горавіца (канец XIX стагоддзя), і палатно XVII стагоддзя «Баль у польскім замку». Звычайна яны аздабляюць музей-сядзібу кампазітара Міхаіла Глінкі ў Наваспасскім каля Смаленска, нагадваючы пра беларуска-польскія карані яго сям'і.

На адкрыцці экспазіцыі дырэктарка Смаленскага музею, сама беларуска і «пасол беларускай культуры» ў Расіі Надзея Валасянкова з хваляваннем казала пра няпросты лёс смаленскіх экспанатаў, буйнейшага збору ў паўмільёна адзінак захоўвання. Яна заўважыла, што Смаленск — горад, не чужы беларускай гісторыі, — экспанатамі свайго музея жыве «ў адзінай культурнай еўрапейскай прасторы» з Беларуссю. Таму і 61 твор у мінскай экспазіцыі падабраны, як у зале старасвецкага палаца, як гэта было ў Пацаў з Сапегамі. Апрача сямейных партрэтаў — біблейскія і гістарычныя сюжэты, жывапіс мастакоў фламандскай, галандскай, французскай, нямецкай школ. Краявід Смаленска XIX стагоддзя, вобразы смаленскіх святароў і купцоў, і нямала прадметаў дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва: кубкі, браціны, вазы, статуэткі, якія адраджаюць атмасферу сядзібнага інтэр'ера. І перліны выставы, «нацыянальны гонар Беларусі», чатыры слуцкія паясы майстэрні Лявона Маджарскага і іх імітацыі з польскай персіярні Якуба Пасхаліса.

Адчыніўшы экспазіцыю ў 65-я ўгодкі вызвалення Мінска ад немцаў у 1944 годзе, смаляне зрабілі беларусам нашмат больш духоўны падарунак, чым прынёс пампезны бляск афіцыйных святкаванняў апошніх дзён. Беларусь залішне шмат страціла ў паўстаннях XIX стагоддзя, у рэвалюцыях і войнах XX. Многае вывезена ў Расію, многае расцерушылася па свеце. Вяртанне магчымасці бачыць кожную адзінку страчанай нацыянальнай спадчыны для нас мае вялікае значэнне. А Расія мае вялікія магчымасці вяртання Беларусі сваіх культурных запазычанасцяў перад ёй.

ЦІКАВА

# РАЙДЭРЫ БЕЛАРУСКІХ ЗОРАК

**Нядаўна дырэктар «Славянскага базару» Радзівон Бас выказаў сваю незадаволенасць райдэрам пераможцы «Еўрабачання–2009» Аляксандра Рыбака. Для артыста патрабавалася «здаровае, свежае, паўнавартаснае харчаванне»: 10 бутэлек піва, бутэлька віна, больш за 70 бутэлек вады і напояў, кава, сок, гарбата і жавальная гумка. Акрамя таго запоўнены, аплачаны міні-бар ва ўсіх нумарах каманды Рыбака. 3 ежы — садавіна, арэхі і кілаграм шакаладу.**



«Еўрарадыё» выравшыла даведацца, якія райдэры бываюць у беларускіх зорак. Напрыклад, «Сябры» просяць 1 нумар «люкс», 2 нумары паўлюкс і 7 аднапакаёвак. Таксама ў райдэры «Сяброў» адразу пасля пераліку шматлікай апаратуры, патрэбнай для жывога гуку, музыкі просяць два прайгравальнікі мінідыскаў. Дарэчы, невыкананне райдэру можа прывесці да адмены канцэрту. Але беларускія выканаўцы заўсёды гатовыя знайсці кампраміс з арганізатарамі. Напрыклад, мастацкі кіраўнік дзяржаўнага ансамбля «Песняры» Вячаслаў Шарапаў увогуле не памятае бытавога райдэру гурта. Маўляў, музыкаў цікавіць толькі абсталяванне, а ўсё астатняе іх не турбуе.

Самы актыўны беларускі гурт «Ляпіс Трубяцкой» таксама не цікавяць бытавыя ўмовы. Галоўнае — каб музыкам не перашкаджалі рухацца паводле гастрольнага графіку, — расказаў прадзюсер «Ляпісаў» Яўген Калмыкоў: «Справа ў тым, што ў «Ляпісаў» шмат канцэртаў, і галоўнае — не тармазіць іх рух. Яны павінны спаць і павінны паесці, але палова — вегетарыянцы. Ніякіх спецзамоў няма, усё сярэднеарыфметычнае. Як яны рухаюцца, якія ў іх нумары, якая ежа, якія напоі піць — мы на гэта не звяртаем увагі».



У выніку можна сказаць, што беларускія музыкі патрабуюць ад арганізатараў няшмат і амаль заўсёды можна з імі дамовіцца. Складаней сітуацыя з замежнымі зоркамі, з якімі бываюць і бытавыя складанасці. Напрыклад, знайсці нешта такое, чаго ў Беларусі няма і ніколі не было.

**Даведка:**

Райдэр — гэта спіс патрабаванняў зорак да арганізатараў канцэрта. Само паняцце з'явілася ў 20-х гадах мінулага стагоддзя. Мала хто ведае, што звычайна райдэры пішуць менеджэры артыстаў. Апошнія могуць нават не ведаць «сваіх» пажаданняў.

Пра самыя запамінальныя пункты райдэраў замежных артыстаў, і чаму яны патрабуюць значна больш за беларусаў, расказаў дырэктар прадзюсерскага цэнтру «Клас-клуб інтэртэйнмэнт» Генадзь Шульман:

«Цяпер у мяне на руках райдэр Джона Лорда (адзін з самых уплывовых клавішнікаў у рок-музыцы, удзельнік гурта «*Deep Purple*», з 2002 года займаецца сольнай кар'ерай), які запрасіў паводле тэхнічнага райдэра такі раяль, якога ў Беларусі ўвогуле няма. А два гады таму, калі рабілі канцэрт Дэвіда Кавердэйла (вакаліста гуртоў «Deep Purple» і «*Whitesnake*»), ён папрасіў такі від казінага малака... Скажам, дзякуй богу, што ехалі сябры з Лондана, якія адтуль і прывезлі малако для спевака. Проста замежныя зоркі прызвычаіліся, што ў нармальных гарадах і краінах іх патрабаванні выконваюцца, а ў нас з гэтым узнікаюць праблемы».

Згодна са словамі Шульмана, у выпадку невыканання хаця б аднаго пункту райдэра арганізатараў можа чакаць не толькі вялікая няўстойка, але і адмена канцэрту. Праўда, з прадзюсерскім цэнтрам такога не бывала.

Шульман прызнаецца: да Беларусі пакуль папросту не даехалі сапраўдныя мега-зоркі з шалёнымі райдэрамі. Напрыклад, Пол Макартні. Рокер не толькі не ўжывае мяса, але забараняе ўсім супрацоўнікам канцэртнай пляцоўкі на яго вачах есці прадукты жывёльнага паходжання. Дарэчы, мэбля для экс-бітла не павінна быць абабіта натуральнай скурай: выключна натуральнымі тканінамі, нават без малюнкаў. Улічваючы высокія кошты на квіткі, яшчэ да з'яўлення Макартні на сцэне арганізатарам неабходна закрыць тканінай усе вольныя месцы ў залі.

Райдэр Ігі Попа можна ўвогуле чытаць як мастацкі твор — бо ў ім больш жартаў і здзекаў, чым сур'ёзных патрабаванняў. Напрыклад, спявак патрабуе штодня прыносіць да яго ў нумар брокалі, якую бацька панкрок не пераносіць. Маўляў, ён будзе выкідаць капусту і тым самым уздымаць настрой. Таксама каля гатэля яго павінны сустракаць сем карлікаў на «Ягуары» і суправаджаць да пляцоўкі.

Нямала праблемаў узнікае і з райдэрам Наомі Кэмбэл, якая патрабуе прафесійную масажыстку не старэйшую за 16 год. А гурт «*Bloodhound Gang*» патрабуюць, каб у грымёрцы стаялі вазы з *M&M's* любога колеру, акрамя карычневых. То бок, арганізатарам трэба рукамі выбіраць з пачак цукеркі гэтага колеру.

**Паводле «Еўрарадыё»**

## НАВІНЫ КУЛЬТУРЫ

### «ЗІМОВЫЯ СЮЖЭТЫ»

**У Мінску, у Гарадской мастацкай галерэі твораў народнага мастака Беларусі Леаніда Шчамялёва, праходзіць выстава 16 акварэльных пейзажаў мінскага мастака Уладзіміра Гераўкера «Зімовыя сюжэты».**

«Хтосьці палічыць дзіўным, што тэмай летняй выставы пейзажнага жывапісу стала зіма, — адзначыла дырэктар галерэі Тацццяна Бембель. — Філасофская і паэтычная традыцыя разглядаць поры года і іх змену як метафару этапаў чалавечага жыцця часам напаўняе пейзажны жывапіс больш глыбокім сэнсам, чым мудрагелістая сюжэтнасць шматфігурных палотнаў».

Акварэлі Гераўкера стрыманыя і часам змрочныя, лаканічныя ў кампазіцыйных, танальных і колеравых рашэннях, тэхнічных прыёмах. Падкрэсленае пазбяганне спецэфектаў адпавядае «зімоваму» філасофскаму настрою: смешна і амаральна мітусіцца перад «велічнымі рысамі прыроды, што памірае». Аўтарская пазіцыя мастака суадносіцца з блізкім да класічнай школы разуменнем пейзажу, што ідзе ў расійскім жывапісе ад Ісаака Левітана або, у некаторых момантах, ад работ беларускага майстра пейзажу Віталя Цвіркі, адзначыла мастацтвазнаўца.

Уладзімір Гераўкер піша акварэллю ўсё свядомае жыццё (нарадзіўся ў 1947 годзе ў Мінску, у 1975 годзе скончыў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут).

«Як і ў большасці акварэлістаў, яго раман з вадзянымі фарбамі — занятак для душы. Такое стаўленне да акварэлі характэрна нават для самых «акварэльных» краін, скажам, для Вялікабрытаніі, дзе тэхніка акварэлі стала для мастакоў арыстакратычным хобі, якое мае на ўвазе наяўнасць сур'ёзнага занятку», — сказала Тацццяна Бембель.

Выстава працуе да 30 ліпеня.

### ШАЦІЛІНСКІ ВОСТРАЎ

**Завяршаюцца археалагічныя даследаванні Шацілінскага Вострава — умацаванай сядзібы XVI стагоддзя на правым беразе Бярэзіны на тэрыторыі цяперашняга горада Светлагорска.**

Пра гэта паведаміў навуковы кіраўнік раскопак Сяргей Рассадзін, доктар гістарычных навук, член Геральдычнага савета пры прэзідэнце Беларусі.

Шацілінскі Востраў, які дакументальна датуецца 1560 годам, з'яўляецца гістарычным ядром сучаснага Светлагорска, які да 1961 года называўся Шацілкі. Пасяленне існавала тут ужо з VII стагоддзя, а некаторыя знаходкі адносяцца да V стагоддзя — перыяду антычнасці.

Як зазначыў вучоны, трэці год на тэрыторыі Шацілінскага Вострава, плошчай прыкладна 250 квадратных метраў, вядуцца раскопкі, якія падтрымліваюцца грамадскасцю горада, кіраўніцтвам вобласці і раёна, а таксама Светлагорскага дзяржаўнага індустрыяльнага каледжа. У сёлетні археалагічны сезон запланавана завяршэнне раскопак.

«Па выніках археалагічных даследаванняў і апісання аналагічных драўляных умацаваных сядзіб беларускай шляхты XVI–XVII стагоддзяў грамадскасць горада прапануўвае ўладам ажыццявіць гістарычную рэканструкцыю Шацілінскага Вострава з агароджай, садам і гаспадарчымі пабудовамі», — паведаміў вучоны. Паводле яго слоў, у аднаўленай сядзібе плануецца размясціць археалагічную экспазіцыю Музея гісторыі Светлагорска і выставу мясцовых рамёстваў.

### «МІЛЕНІУМ ЛІТВЫ»

**Аргкамітэт «Міленіум Літвы» рыхтуе да выдання энцыклапедычны ілюстраваны даведнік, прысвечаны 1000-годдзю першага ўзгадвання племені літва ў нямецкіх Кведлінбургскіх аналах, паведаміў 14 ліпеня на прэс-канферэнцыі ў Мінску намеснік старшыні аргкамітэта мастак Мікола Купава.**

Паводле яго слоў, у даведніку будуць адлюстраваныя як матэрыялы навуковых даследаванняў беларускіх вучоных, якія займаюцца вывучэннем праблемы станаўлення Вялікага княства Літоўскага, так і творы айчынных мастакоў і літаратараў па гэтай тэматыцы.

Як адзначыў Купава, у пачатку верасня ў сталіцы адбудзецца фотавыстава, прысвечаная тысячагоддзю першай пісьмовай згадкі назвы «літва», а 22 кастрычніка ў сталічным Палацы мастацтва — нацыянальная мастацкая выстава «Міленіум Літвы». У праграму выставы, якая праводзіцца сумесна з Беларускім саюзам мастакоў і размесціцца ва ўсіх залах палаца, уключаны мастацкі конкурс для дзяцей і моладзі «Літва тысячагадовая — наш родны край», рыцарскі турнір, а таксама фестываль беларускай музыкі, песні і паэзіі. Сярод мерапрыемстваў фестывалю — конкурс «Прэм'ера твору» (31 кастрычніка), канцэрт аўтарскай песні (8 лістапада) і заключны канцэрт (15 лістапада).

Паводле слоў старшыні аргкамітэта, доктара гістарычных навук прафесара Анатоля Грыцкевіча, міленіум у большай ступені тычыцца Беларусі, чым Літвы. Гаворка ідзе пра першае летапіснае ўзгадванне не дзяржавы, а племені літва, гістарычная тэрыторыя якога знаходзілася на захадзе сучаснай Беларусі, падкрэсліў вучоны. Ён адзначыў, што толькі ў канцы 1230-х — пачатку 1240-х гадоў на тэрыторыі сучаснай Беларусі стварылася дзяржава Вялікае княства Літоўскае і Рускае са сталіцай у Навагрудку. «Таму менавіта ў Беларусі былі створаны аргкамітэт «Міленіум Літвы», каб нагадаць усім: у свой час нашы продкі зваліся не беларусамі, а русінамі або ліцвінамі», — адзначыў Грыцкевіч.

**Марат Гаравы, БелаПАН**

**Новы Час**
Масава-палітычная газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар **Алена Анісім**
Шэф-рэдактар **Аляксей Кароль**

Пасведчанне аб рэгістрацыі № 1798 ад 12 верасня 2008.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў».

Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220012, г. Мінск, зав. Інструментальны, 6-214.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 280 17 91.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова №
Падпісана да друку 17.07.2009. 8.00.
Наклад 5050 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы.
Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.